ПЕРАТОЧА 2007 ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Успамін пра Тамару ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 31 (2673) Год LII | Беласток, 5 жніўня 2007 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Сёлетнія Трыялогі вылучаліся прысутнасцю яўрэйскай тэмы. Разважанні пра ролю яўрэяў у беларускай літаратуры папярэдзілі экскурсіі па Крынках. Да вайны ў мястэчку жыло больш за чатыры тысячы яўрэяў...

Трыялогі з яўрэйскай тэмай

На Беларускія Трыялогі ехала я пабачыць „Анталогію беларускай паэзіі" на італьянскай мове. Аднак укладальнік і рэдактар гэтай знакавай кніжкі, прафесар Антон М. Рафо якраз жаніўся і не прыехаў.

— Так ці інакш, анталогія ёсць і выйдзе асобнай кніжкай, — кажа Сакрат Яновіч — арганізатар міжнародных літаратурных семінараў, якія з 1999 года ладзіць Villa Sokrates.

Ёсць таксама „Анталогія беларускай паэзіі" на венгерскай мове. Творы паэтаў — надрукаваныя ў апошнім штогодніку „Annus Albaruthenicus". Аднак існуюць праблемы, каб падборку твораў выдаць асобным, кніжным выданнем. Калі перакладчык Лаяш Палфалві звярнуўся за дапамогай у беларускае пасольства ў Будапешце... адправілі яго ў Беласток. Які будзе вынік сустрэчы ў беластоцкім Генконсульстве РБ? Ці беларускія ўлады палічаць важным прамоцыю сваёй краіны ў Венгрыі? Справа ў тым, што „Annus Albaruthenicus" адрасаваны вузкаму колу славістаў.

Фота Юркі ХМЯЛЕЎСКАГА

Жыдоўскі ўхіл меў таксама канцэрт гродзенскага барда Віктара Шалкевіча

Сёлетнія Трыялогі (26-30 ліпеня), вылучаліся прысутнасцю яўрэйскай тэмы. Разважанні пра ролю яўрэяў у беларускай літаратуры папярэдзілі экскурсіі па Крынках. На пераломе XIX і XX ст. у мястэчку жыло больш за шэсць тысяч жыхароў з чаго 4500 яўрэяў. Ад іх асталася толькі малая сінагога, у якой сёння знаходзіцца Дом культуры (а раней — кінатэатр „Крокус"). Вялікая сінагога (самая важная ў рэгіёне) была ўзарваная пры народнай уладзе! Зараз руіны вернуты жыдоўскай гміне. Экскурсія на кіркут пакінула яшчэ больш прыгнятальны ўспамін. На месцы спачыну пануе хаос як да стварэння свету. Ацалелыя мацэвы бязладна раскінуты па зарослым пустазеллем пляцы. Пры тым усім лакальныя ўлады прапануюць гэтае месца наведваць турыстам.

Фота Юркі ХМЯЛЕЎСКАГА

Злева: Майкл Флемінг з Лондана, Лаяш Палфалві з Венгрыі і Матыяс Новак са Швецыі

Сцены агратурыстычнай кватэры спадарства Евы і Марка Маршалкаў у Лапічах, дзе ўжо традыцыйна адбываюцца Трыялогі, у гэты раз былі прыздоблены графікай „Пінкас Крынкі" Монікі Пяткель. Жыдоўскі ўхіл меў таксама канцэрт гродзенскага барда Віктара Шалкевіча.

Асноўнай мэтай Трыялогаў з'яўляецца прамоцыя беларушчыны ў свеце. Мерапрыемства мае сваіх пастаянных удзельнікаў, як хаця б згаданы ўжо Лаяш Палфалві з Венгрыі, які ў гэты раз прачытаў даклад пра беларускія матывы ў творчасці Юзэфа Мацкевіча. Майкл Флемінг з Лондана гаварыў пра маргіналізацыю беларускай меншасці, якая ў постсавецкай палітычнай культуры закінутая па-за межы палітычнай грамадскасці і не мае голасу ў справах, якія яе датычаць. Матыяс Новак прачытаў даклад пра песімістычны вобраз беларусаў у шведскіх і нямецкіх СМІ. Самая вялікая колькасць артыкулаў у іх датычыць спорту і палітычных падзей, а пытанне беларускай культуры амаль не выступае. Юры Вашкевіч з Мінска працягваў свае мінулагоднія разважанні пра асаблівасці беларускага саветызму. На Трыялогах выступілі таксама дакладчыкі з Беласточчыны — прафесар Яўген Мірановіч і Яўген Вапа. Першы закрануў усё актуальную тэму пад інтрыгуючым загалоўкам: „Ці патрэбная Еўропе Беларусь", а галоўны рэдактар „Нівы" расказаў пра 50-годдзе нашага тыднёвіка. Усе выступленні, якія прагучэлі сёлета на Трыялогах, будуць надрукаваны ў новым, ужо дзевятым, томе штогодніка „Annus Albaruthenicus".

Фота з выдання „Holocaust Kryńskich Żydów", Krynki 2007

Ганна КАНДРАЦЮК

Страна рабов ... ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

Сённяшняя Расія для беларусаў не толькі галоўны эканамічны партнёр. Гэта краіна не збіраецца выпускаць Беларусь з-пад свайго кантролю і многае ў нас будзе залежаць ад таго, якая палітычная канфігурацыя складзецца там. Таму я ніяк не мог абысці тэму, якую падняў у сваім артыкуле „Дзень Расіі" Васіль Сакоўскі (Ніва № 27)...

Запішы дзіця ў беларускі клас! ☞ 2

Павал МАЖЭЙКА

Пра адкрыццё беларускіх першых класаў з гарадскім упраўленнем адукацыі яшчэ ў траўні бягучага году дамовілася Гродзенская гарадская рада Таварыства беларускай мовы (ТБМ). Беларускамоўныя першыя класы павінны былі з'явіцца ў шасці гродзенскіх гімназіях і школах. Аднак высветлілася, што чыноўнікі ад адукацыі і не збіраюцца інфармаваць бацькоў пра тое, што яны маюць магчымасць аддаць сваіх дзяцей у беларускамоўныя класы...

Культура ў Кляшчэлях ☞ 4

Аляксандр Вярбіцкі

Сёлета здаем для карыстання адрамантаваны будынак былой школы ў Кляшчэлях, куды пераселіцца Гарадскі асяродак культуры. Будзе там таксама пункт турыстычнай інфармацыі, керамічна-ганчарная майстэрня, два начлежныя нумары, камп'ютэрная, мастацкая і музычная майстэрні ды глядзельная зала...

Свята ў беларускім засценку (1) ☞ 5

Ганна КАНДРАЦЮК

Спачатку здавалася мне, што падарожжа ў беларускі засценак будзе адначасова падарожжам у часе. Хоць — не зусім так. Мае ўяўленні засценка былі аснаваны на літаратуры пачатку XX ст., асабліва на драмах Купалы і Аляхновіча. А вопыт гаварыў іншае. Такога як шляхецкі засценак не павінна быць у постсавецкай і ўсё яшчэ калгаснай Беларусі. Хоць бы з-за гістарычнай помсты. У засценку, як вядома, напрыканцы XIX і ў пачатку XX стагоддзяў выспявала ідэя адраджэння Незалежнай Беларусі...

9 770546 196000

Страна рабов, страна господ...

Сённяшняя Расія для беларусаў не толькі галоўны эканамічны партнёр. Гэта краіна не збіраецца выпускаць Беларусь з-пад свайго кантролю і многае ў нас будзе залежаць ад таго, якая палітычная канфігурацыя складзецца там. Таму я ніяк не мог абысці тэму, якую падняў у сваім артыкуле „Дзень Расіі" Васіль Сакоўскі (Ніва № 27).

Аўтар „Дня Расіі" шчыра і наіўна захапляецца постаццю Пуціна. Верыць у тое, што той добра ведае, што патрэбна сённяшняй Расіі і „дабіваецца таго". Асабліва спадабалася Сакоўскаму, што на святкаванні Дня Расіі Уладзімір Уладзіміравіч узнагароджваў расійскіх навукоўцаў (прыярытэт быў аддадзены работнікам ваенна-прамысловага комплексу) і дзеячаў культуры прэміяй імя „патрыярха адроджанай Расіі Аляксандра Салжаніцына", а пасля знайшоў час наведаць таго асабіста. Напрыканцы аўтар артыкула прыходзіць да высновы, што менавіта такая моцная рука як у КГБэшніка Пуціна, які можа падняць Расію з каленяў, і патрэбна расіянам. Яны „такіх павадыроў любяць".

А ці задумаўся пра тое аўтар, якім чынам дасягаецца такая фанатычная любоў? Ці правёў аналогіі з любоўю кітайцаў да важака Мао, паўночных карэйцаў да свайго рулявога? Ды што там Азія! Яшчэ нядаўна і рускія людзі (каго не паспелі расстраляць НКВДэшнікі) хадзілі з партрэтамі Іосіфа, а немцы маліліся на Адольфа, які абяцаў „падняць з каленяў" прайграўшую Першую сусветную вайну Германію.

А адказ просты і ляжыць на паверхні. Гэта ж класіка дыктатуры! Трэба толькі пазбавіць людзей інфармацыі, забраць у іх памяць і данесці сваю сфальшаваную гісторыю, чым і займаецца клан Пуціна. Тым больш, што глеба для такога семя ў Расіі даўно падрыхтаваная і ўгноеная. Цэлыя пакаленні расіян вучылі любіць тыранаў, такіх як Іван Грозны, Пётр I, Кацярына Вялікая... А, прыкладам, такія постаці як рэфарматар Павел I, які ў разуменні свабоды і права волевыяўлення кожнага свайго падданага апярэдзіў Пуціна мінімум на мільён гадоў, і імкнуўся вярнуцца да палітычных ідэалаў Маскоўскай Русі, абвяшчаліся слабавольнымі і бесхарактарнымі, бо замала пралілі расійскай крыві.

І ці успомніў шчыра паважаны мной аўтар „Дня Расіі", што рабіў Пуцін, калі сумленных людзей, якія выступалі супраць пераследу ўсё таго ж Салжаніцына, цкавалі спецслужбы? Тады малады афіцэр КГБ старанна вучыўся навыкам як пераследаваць Салжаніцынаў, як іх знішчаць, і як выкарыстоўваць пры неабходнасці ў сваіх мэтах. Навука спатрэбілася. І Пуцін ужо раздае прэміі імя „былога" Салжаніцына стваральнікам новай зброі (крок палітычны, каб ізноў запалохаць ядзерным кулаком свет). А новыя Салжаніцыны, кшталту Валерыі Навадворскай, што не могуць жыць у дурмане ілжы, пазбаўляюцца магчымасці данесці сваю думку да суайчыннікаў. Бо яны бачаць іншы, бяскроўны шлях развіцця Расіі. І не могуць змірыцца з тым, што каб „падняць краіну з каленяў", трэба паставіць на калені перад „бацюшкам царом" яе народ. Усіх. Ад палітыкаў і алігархаў да прачкі. Бо ўсе яны, толькі халопы. І павінны служыць „моцнай руцэ".

На шчасце, зараз ёсць ненавісны ўсім дыктатарам Інтэрнэт, з якім яны не ведаюць што рабіць. І раю пачытаць пра любоў да Пуціна на www.grani.ru, ці www.politzeki.ru, пакуль тэхналогіі фільтрацыі інфармацыі ў Інтэрнэце, што ўжо дзеюць у Кітаі, не знішчылі іх.

І вельмі раю не блытаць нібыта растучы ў Расіі патрыятызм з вялікадзяржаўным шавінізмам. Бо, як паказвае гісторыя, ад такой палітыкі пакутуюць і рускія таксама. Іх кроў ужо льецца на Каўказе. Бо для такой ідэалогіі патрэбна вайна. Як халодная, так і сапраўдная. Інакш як растлумачыць народу неабходнасць „цвёрдай рукі".

Вось толькі рабства і ідалапаклонства ніколі не спрыялі сапраўднаму развіццю краіны, акрамя, безумоўна, вайсковага ўзмацнення. А такія паняцці як свабода і вольнасць ужываюцца ў той сітуацыі толькі ў дачыненні да дзяржавы, але ніяк не для яе грамадзян са статусам халопаў. Дык як жа трэба ненавідзець свой народ, каб павесці яго гэтым шляхам! Таму лепш пажадаем расіянам вялікай, квітнеючай і моцнай Расіі без Пуцінаў. Такой краіны, дзе сапраўдныя патрыёты, як некалі высланы на Каўказ Лермантаў, не пісалі б з болем у сэрцы:

Прощай немытая Россия,
Страна рабов, страна господ...

І, перш чым захапляцца такім кіраўніком як Пуцін, раю спытаць самога сябе: „А ці хацеў бы я, каб мае дзеці жылі пад яго кіраўніцтвам і гінулі ў Ічкеры «во имя» таго, каб Расію баяўся ўвесь свет?"

Віктар САЗОНАЎ

Запішы дзіця ў беларускі клас!

У Гродне Рухам „За Свабоду" распачатая кампанія падтрымкі беларускамоўнай школьнай адукацыі „Запішы дзіця ў беларускі клас". Мэта кампаніі — пераадолець інфармацыйную блакаду вакол беларускамоўнай адукацыі, якую стварылі гарадскія ўлады.

Пра адкрыццё беларускіх першых класаў з гарадскім упраўленнем адукацыі яшчэ ў траўні бягучага году дамовілася Гродзенская гарадская рада Таварыства беларускай мовы (ТБМ). Беларускамоўныя першыя класы павінны былі з'явіцца ў шасці гродзенскіх гімназіях і школах. Аднак высветлілася, што чыноўнікі ад адукацыі і не збіраюцца інфармаваць бацькоў пра тое, што яны маюць магчымасць аддаць сваіх дзяцей у беларускамоўныя класы.

ЗАПІШЫ
ДЗІЦЯ Ў БЕЛАРУСКІ КЛАС!
БЕЛАРУСКАЯ МОВА - ГЭТА МОВА ЭЛІТЫ І БАГАТЫХ ЛЮДЗЕЙ!
БЕЛАРУСКАЯ МОВА - ГЭТА МОВА БУДУЧЫНІ!
ДАЛУЧАЙСЯ!

Вынік — на сённяшні дзень бацькі толькі аднаго дзіцяці падалі заяву на навучанне ў беларускамоўным першым класе. Але дзеля таго, каб стварыць першы ад шмат гадоў беларускамоўны клас у Гродне, неабходны заявы бацькоў яшчэ дзевяці патэнцыйных першакласнікаў.

Падобныя дазволы на адкрыццё беларускіх класаў гродзенскія ўлады даюць не першы раз. Але ад дазволу да рэальнага фармавання класа — шлях доўгі. Фармальна — каб адчыніць беларускі клас — трэба заявы ад бацькоў дзесяці вучняў. І штогод улады маюць тое ж самае апраўданне — «бацькі не хочуць весці дзяцей у беларускія класы».

Гэтыя дазволы — па сутнасці — стварэнне гета. Можна пайсці наадварот — усіх залічвайце ў беларускія класы і толькі тых, хто напіша адмысловыя заявы, пераводзьце ў рускамоўныя. Ніколі не будзе праблем з заявамі.

Але на самай справе бацькам гарадскія ўлады і адміністрацыя школ не паведамляюць пра магчымасць навучаць дзяцей па-беларуску.

Вось і ў гэтым годзе толькі школа № 32 правяла хоць нейкую інфармацыйную кампанію сярод бацькоў: на дошцы аб'яў размясцілі адмысловую абвестку, намеснік дырэктара сустрэлася з бацькамі ў дзіцячых садках, дала абвестку ў газету. У СШ №10 абмежаваліся толькі абвесткай на дошцы інфармацыі ў школе. Кіраўніцтва іншых школ, дзе ёсць магчымасць з'яўлення беларускіх класаў, пра гэткую магчымасць бацькам нават не паведамляе.

Больш таго, напрыклад у гімназіі № 6, намесніца дырэктара Алена Маянская заявіла наступнае: „А я наогул не ведаю, хто вам даў такую інфармацыю — мы не збіраліся і не збіраемся набіраць беларускамоўныя першыя класы. Гэта некалі даўно такое было". Упраўленне адукацыі вырашыла „дазволіць" на адкрыццё ў гэтай школе беларускага класа, а пра сваё рашэнне дырэкцыі школы і не паведаміла.

У сярэдняй школе № 26, якая доўгі час заставался адзінай беларускай школай у больш як 300-тысячным Гродне, фармаваць беларускія класы таксама не збіраюцца. У гімназіі № 7 намесніца дырэктара Ларыса Каржова патлумачыла, што навучэнцам гімназіі цяжка вучыць беларускую мову, бо „атрымліваецца так, што ў нашых дзяцей яна — як бы другая замежная мова".

Гэтай уладзе сёння не залежыць на беларускамоўнай адукацыі. Таму наракаць на заняпад мовы, на антыбеларускую палітыку ўлад, на свядомае вынішчэнне беларускамоўнага школьніцтва, заклікаць чыноўнікаў прытрымлівацца Канстытуцыі і закону аб дзяржаўнасці беларускай мовы бессэнсоўна. Вярнуць мову ў школы можна грамадзянскай актыўнасцю, звяртаючы ўвагу на тое, што беларуская мова — гэта модная, сучасная, перспектыўная штодзённая неабходнасць. Мы кажам: «Беларуская мова — гэта мова эліты і багатых людзей! Беларуская мова — гэта мова будучыні! Далучайся! Запішы дзіця ў беларускі клас!»

Павал МАЖЭЙКА

Вачыма еўрапейца

(Міма)лётная справа

Больш за дзесяць гадоў таму, значыць, у мінулым стагоддзі, я вярнуўся ў Беласток. Тады гаварылі, што стане ён метраполіяй ды ўзнікнуць тут асяродак публічнага тэлебачання, самастойны універсітэт і рэгіянальны аэрапорт. Тэлецэнтр узнік, хоць ад тых гадоў і эфірны час, які дала яму ўправа тэлекампаніі, неяк спецыяльна не павялічваецца, і якасць перадач боўтаецца ва ўласных (найчасцей палітычных) спалохах. Універсітэт таксама ёсць, хоць сваіх дзяцей лічу за лепшае паслаць у вучэльню хоць бы ў сталіцы. Ну і ўрэшце тое лётнішча. Няма яго, хоць мела б быць яно — згодна планам ужо ў гэтым стагоддзі — або на беластоцкіх Крыўлянах, або ў падбеластоцкіх Тапалянах.

На апошняй сесіі ваяводскага самаўрада якраз пра лётнішча пайшла гаворка. Я з дзівам прыслухоўваўся выступленню падляшскага маршалка Дарыюша Пянткоўскага. Хоць у звычайны дзень у Маршалкоўскай управе адказвае ён за культуру і падобныя ёй справы, то гаварыў і аб перспектывах узнікнення аэрапорта з сапраўды майстэрскай дакладнасцю. Аказалася, што ідэя, падтрымліваная задзіночанымі беластоцка-гарадской і падляшска-ваяводскай самаўрадавымі сіламі, каб аэрапорт узнік на Крыўлянах, мае малыя шанцы ажыццявіцца. Прынамсі я дайшоў да такога вываду, слухаўшы маршалка. Справа ў грашах, але і ў супраціве, які выказаў старшыня Управы цывільнай авіяцыі (УЦА) Гжэгаж Крушынскі. Не пагаджаецца ён на тое, каб узлётная паласа на Крыўлянах мела крыху больш за 1 420 метраў. Спасылаючыся на нормы і правілы, яе даўжыня мусіць складаць сама меней 2 100 метраў. Гэтаксама і з планаванай тут шырынёй паласы, якая тут завузкая. Падобныя сумненні выказаў старшыня Крушынскі ў справе іншых параметраў гэтага крыўлянскага абшару, на якім адзіную ў Беластоку імшу адслужыў папа Ян Павел II. Вось паўтару за яго лістом: „Тэхнічная інфраструктура аэрапорта павінна гарантаваць прыняцце рэактыўных самалётаў сярэдняй далёкасці палёту, разлічанага на 150 пасажыраў (напр. Боінг В-737) ды абслугоўванне прынамсі 250 000 пасажыраў у год". Гэтыя і іншыя сумненні старшыні УЦА і іншых чыноўнікаў розных цэнтраў у Варшаве і Бруселі спрычыняюцца да таго, што лётнішча на Крыўлянах мае марныя шанцы на ўзнікненне, прынасмі калі справа ў фінансаванні яго еўрасаюзнымі грашыма ў найбліжэйшыя гады. Трэба было б перабудоўваць, высякаць і забудоўваць ад кораня амаль палову Беластока (з паўднёва-ўсходняга боку).

З нуля затое (бо на Крыўлянах знаходзіцца база Падляшскага аэраклуба) трэба было б ствараць лётнішча ў Тапалянах. Так вось людзям маршалка прыйшло ў галовы: а чаму ж не знайсці абшар пад аэрапорт у зусім іншым месцы? І знайшлі. І, самае цікавае, найбольш плоскае, значыць, найбольш адпаведнае месца ў ваколіцах тэлевізійнай і універсітэцкай метраполіі знаходзіцца ў наваколлі Заблудава. Цэны на зямлю ўжо можна павышаць. А, самае важнейшае, можна будзе іх павышаць і павышаць, паколькі вырашэння ў найбліжэйшы час у справе пабудовы аэрапорта, мабыць, і не будзе. Тут прыгадаю ў гэтым кантэксце, што пратэсты добра ўздзейнічаюць на павышэнне вартасці грунтаў пад якое-небудзь „дзяржаўнае" будаўніцтва. Ведаюць аб гэтым, пэўна, жыхары беластоцкіх Дайлідаў і ваколіц, пры якіх мела б узнікнуць лётнішча Крыўляны, якія ў час сесіі і пры галасаванні радных (толькі двух было супраць) у справе аэрадрома крычалі: „Ганьба!".

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

„Ператоча” - у атмасферы юбілею

У гэтым годзе „Ператоча” адзначыла першы свой юбілей. 27 і 28 ліпеня ў белавежскім амфітэатры адбыліся V Мастацкія інтэграцыйныя сустрэчы „Ператоча 2007”. У ліку выканаўцаў найбольш было беларускіх калектываў, якія прыехалі з мясцовасцей, распаложаных у галоўным на прыпушчанскай тэрыторыі па абодвух баках мяжы. Традыцыйна спявалі і танцавалі таксама прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей, якія ў мінулым жылі або цяпер насяляюць прыпушчанскія землі.

Перад мерапрыемствам не было ў Белавежы такога натоўпу як на купальскім свяце, але заўважны быў зрух, якога няма ў звычайныя дні. Прыцягвалі ўвагу калектывы, якія перад выступамі каталіся на брычках па Белавежы і спевам рэкламавалі „Ператоча” ды заахвочвалі мясцовае насельніцтва і турыстаў прыйсці на канцэрт. Хаця перад мерапрыемствам над Белавежскай пушчай прайшоў праліўны дождж, людзі хутка пачалі збірацца на пляцоўцы амфітэатра. Сярод публікі былі генеральны консул РБ у Беластоку Міхал Аляксейчык, леснікі, прадстаўнікі экалагічных арганізацый ды жыхары шматлікіх мясцовасцей Гайнаўшчыны.

Мерапрыемства пад ганаровым патранатам маршалка Падляшскага ваяводства адкрылі Мікола Бушко — старшыня Фонду „Царкоўная музыка” і заадно арганізатар „Ператоча” ды старшыня Гміннай рады ў Белавежы Ян Гвай. На назву „Ператоча” і яго ідэалагічныя вытокі спаслаўся старшыня Мікола Бушко. Прыезджыя, якія ўпершыню прыбылі на белавежскае мерапрыемства, даведаліся, што ў клуні знаходзяцца ток і ператоча, на якіх у мінулым ладзіліся сямейныя ўрачыстасці і танцы.

— Клуня ў мінулым была сялянскім банкам і адначасна сімвалам адкрытасці на ўсіх душой і сэрцам, — заявіў Мікола Бушко, звяртаючы адначасна ўвагу, што белавежскае „Ператоча” з'яўляецца месцам адкрытым на ўсе нацыянальнасці, якія пражывалі і жывуць на тэрыторыі Белавежскай пушчы.

— Я гаспадар з Падалянаў. Ёсць у нас клуня і ператоча, — гаварыў старшыня Гміннай рады Ян Гвай, афіцыйна адкрываючы „Ператоча”. Пахваліў ён Міколу Бушко таксама за арганізаванне ў Белавежы многіх іншых мерапрыемстваў.

Першымі на мерапрыемстве выступілі лясныя трубачы, пасля спявалі „Нараўчанкі” і „Капэла з Дубін”. У рэпертуары беларускага калектыву з Нараўкі былі фальклорныя песні, якія добра падыходзілі да прэзентацыі на сапраўдным ператочы ў клуні. Жанчыны з Нараўчанскай гміны прыехалі на мерапрыемства са снапамі жыта і „перапёлкай”.

„Нараўчанкі” прыехалі са снапамі жыта і „перапёлкай”

— Я сёння нажала на сваім полі жыта перад тым як камбайн пачаў яго малаціць. Усім нашым жанчынам выпала па снапку жыта, а для адной асталася „перапёлка”. Упрыгожылі мы яе кветкамі і прывезлі соль ды хлеб — так як гэта было ў час народнага абраду на полі. Збожжа з кветкай, якое далі мы Яну Гваю, можна будзе асвяціць у царкве, — сказала кіраўнік „Нараўчанак” Вольга Савіцкая. — Мы раней спявалі многа аўтэнтычных народных песень, сабраных у сваіх сёлах. Цяпер у нашым рэпертуары многа апрацаваных беларускіх твораў, якіх вучыць нас спяваць Пётр Скепка.

— У мінулым вяселлі і хрысціны рабілі ў клунях, — сказалі Вольга Савіцкая і Вольга Раманчук, а Вольга Сачко пахваліла арганізатараў „Ператоча” за добры прыём і цікавае мерапрыемства.

Паколькі ў Белавежы спяванне і танцы адбываліся на сцэне, якая з'яўлялася толькі сімвалам ператоча, прэзентавалася там многа эстраднай музыкі. Гурт з Дубін выступіў з беларускімі песнямі пад акампанемент музычных інструментаў.

— Мы выступаем таксама з беларускай музыкай, перапрацаванай пад фольк. Карыстаемся народнымі інструментамі, але сёння, на жаль, не было флейты і кантрабаса, — сказаў кіраўнік дубінскага калектыву і заадно музычны апякун „Нараўчанак” Пётр Скепка. — На „Ператочы” нашы хлопцы могуць прыглянуцца іншым выканаўцам і навучыцца новаму.

Першы раз на „Ператоча” прыехалі „Пушчанскія музыкі” — працаўнікі Нацыянальнага парку „Белавежская пушча” ў Рэспубліцы Беларусь, згуртаваныя ў музычным калектыве. Яны і астатнія беларускія калектывы прэзентавалі высокі мастацкі ўзровень спеву. Высокае майстэрства паказаў Дзіцячы калектыў эстраднага танца „Капрыс” з Камянца, які ўжо вядомы жыхарам Гайнаўшчыны ранейшымі выступленнямі. Танцы ў выкананні камянецкіх вучняў найбольш спадабаліся малодшаму пакаленню гледачоў. З невялікім канцэртам выступіў Народны ансамбль беларускай песні і музыкі „Гасцінец” з Гродна, які раней упрыгожваў беларускія мерапрыемствы на Беласточчыне. Прывёз ён і новы рэпертуар, які моцна спадабаўся не толькі беларускай публіцы.

Лавіцкія і курпёўскія танцы ды польскія песні прэзентавалі „Падляшскія зязюлькі” з Бельска-Падляшскага, якія канцэртуюць у многіх польскіх і замежных гарадах. Аднак частка жыхароў Гайнаўшчыны толькі на „Ператочы” ўпершыню мела нагоду паглядзець выступленне моладзі з суседняга горада, якая зрабіла станоўчае ўражанне як на маладых гледачах, так і на старэйшай публіцы. Многімі музычнымі інструментамі карыстаўся маладзёжны лэмкаўскі гурт „Łemko Tower” са Стшэльцаў-Апольскіх. Выступы на лэмкаўскай мове, даволі зразумелай для мясцовай публікі і напевы ў стылі фольк спадабаліся сабраным, якія пасля кожнага нумара горача апладзіравалі лэмкаўскім выканаўцам.

— Мы заснавалі гурт, каб сабраць лэмкаўскую моладзь пры Царкве. Частка вучняў спявае ў нашым царкоўным хоры. Хаця дзейнічаем ад двух гадоў, выязджалі мы ўжо на канцэрты, — паведаміў менеджэр лэмкаўскага калектыву, праваслаўны святар а. Артур Грабар.

Адметным быў выступ цыганскага гурту „Рада” з Гродна. Традыцыйна запрэзентавалі яны меладычныя песні і танцы, выконваныя пад акампанемент гучных інструментаў.

— У нашым гурце займаюцца ромы, беларусы і расіяне. Апрача цыганскай музыкі і танцаў мы выступаем, ужо ў іншым складзе, з танцамі ўсходу і бразільскай музыкай. У ансамблі ёсць людзі з музычнай падрыхтоўкай, — заявіў кіраўнік ромскага гурту Ігар Суворкін.

Меладычная музыка была таксама козырам у час выступлення нямецкага вакальнага калектыву „Лігоцкія верасы” з Ліготы-Прушкоўскай і літоўскага гурту „Telsių Smagratis”. Яўрэйскую музыку запрэзентаваў беластоцкі калектыў „Klezmer Trio”.

У гэтым годзе на „Ператочы” пачала ажыццяўляцца ідэя ўспамінання асоб розных нацыянальнасцей — актыўных стваральнікаў гісторыі і культуры рэгіёна Белавежскай пушчы. Старшыня Фонду „Царкоўная музыка” Мікола Бушко напомніў дзейнасць Францішка Болаза, настаўніка-разьбяра, заснавальніка існуючай па сённяшні дзень гайнаўскай школы інтарсіі. Яму быў прысвечаны канцэрт у выкананні гурту горцаў „Ватра” з Чорнага Дунайца (з Падгалля выводзіўся Францішак Болаз). Музыка розных гатункаў, культур і нацыянальнасцей, а таксама танцы ў выкананні розных калектываў спадабаліся не толькі турыстам. Публіка магла адпачываць на лаўках і пакарыстацца кухняй, якую падрыхтавалі мясцовыя прадпрымальнікі на белавежскае мерапрыемства, ладжанае ў супрацоўніцтве з Белавежскім нацыянальным паркам, Белавежскім асяродкам культуры і мясцовым аддзяленнем Польскага турыстычна-краязнаўчага таварыства. Калі пачынала цямнець, папулярнасцю карысталіся ларкі і кавярні. Некаторыя асобы шпацыравалі па дарожках вакол амфітэатра, куды даходзіла музыка з гукаўзмацняльнікаў.

Шматлікімі музычнымі інструментамі карыстаўся маладзёжны лэмкаўскі гурт „Łemko Tower” са Стшэльцаў-Апольскіх

„Падляшскія зязюлькі” з Бельска-Падляшскага

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Трэба тратуараў

У Новым Ляўкове Нараўчанскай гміны пры тамашняй павятовай дарозе (гэта якраз вясковая вуліца ў Ляўкове) няма тратуараў ні на адной з абедзвюх яе абочын. Жыхары і прыезджыя вымушаны хадзіць па маставой і гэта вельмі небяспечна. Дзеці таксама ж ходзяць па вуліцы.

Зімою шафёр легкавушкі падбіў адну жанчыну (зламаў ёй ключыцу і разбіў чэрап) і яна ледзь выжыла. Ці трэба чакаць чарговага дарожна-транспартнага задрэння?

Рух самаходаў, у тым ліку і грузавікоў з цэглай мясцовага керамічнага завода, вялікі кожны дзень.

Радны Новага Ляўкова выносіў прапанову на сесіі Гміннай рады, каб у вёсцы абмежаваць скорасць праязджаючых аўтамабіляў да 40 км у гадзіну, але Праўленне павятовых дарог (ППД) у Гайнаўцы не дало згоды. Тады радны пачаў хадайнічаць перад уладамі аб пракладцы тратуара хаця б з аднаго боку вуліцы. Нараўчанская гміна адвяла 50 тысяч злотых пад умовай, што рэшту даложыць Павятовае староства. Так і дагаварыліся.

Аднак пракладка тратуараў адтэрміноўваецца, бо ППД 17 ліпеня г.г. дало адказ, што „пачнуць работу недзе ў верасні або кастрычніку 2007 года". Гэта ж дажджлівая пара года! А ў снежні не ласка?! Хто працуе ўлетку, калі зараз такая гарачынь!

Восенню мінулага года ў Старым Ляўкове пачалі „рамантаваць" тратуар: там-сям разабралі і скінулі ў гурбу тратуарныя пліты на ўездах на падворкі. Пліты да гэтай пары прапалі як цень на вадзе. На гэтым рамонт закончылі яшчэ перад ападкамі снегу...

(мох)

Насякомыя памочнікі

Некаторыя людзі стараюцца знішчыць кожнае насякомае: душаць жучкоў і павучкоў рукамі, топчуць іх нагамі. Ці заўсёды яны правільна сябе паводзяць?

Далёка не ўсе насякомыя з'яўляюцца шкоднікамі нашых садоў і агародаў, нашых раслін. Сярод аграмаднай колькасці насякомых бываюць і такія, якія нішчаць шкоднікаў агародніны і фруктаў. Вучоныя назвалі іх энтамафагамі. Прыносяць яны садам і агародам вялікую карысць. Трэба памятаць, што хімікаты нішчаць не толькі нашых шкоднікаў, але таксама памочнікаў.

Людзі з дзяцінства ненавідзяць мух, але часамі і яны нам памагаюць. Для прыкладу, вялізныя мухі — тахіны. Іх лічынкі з'яўляюцца шкоднымі паразітамі для гусеніц і кукалак матылёў. Ёсць жоўтыя мухі падобныя на восы. Іхнія лічынкі з'ядаюць тлі і лістаблошкі.

Усім вядомыя божыя кароўкі нішчаць кляшчоў і тлей. За суткі божая кароўка з'ядае да 200 тлей, а яе лічынкі яшчэ больш. Лічынкі жука крыпталемуса за суткі нішчаць некалькі тысяч яек розных чарвякоў. Многа карысці садам і агародам прыносяць залатавочкі. За 15-20 дзён іх лічынка можа з'есці каля тысячы кляшчоў і столькі ж тлей. Гэтыя насякомыя спажываюць яечкі і лічынкі каларадскага жука.

Дабро раслінам у садзе нясуць павукі і розныя мурашкі. У кожным садзе ці агародзе спаткаем бегаючых па зямлі чорных жукоў і іх лічынкі. Яны з'ядаюць лічынкі і кукалкі бялянкі капусніцы.

Мікалай ВАРАНЕЦКІ

Культура ў Кляшчэлях

Размова з Марыяй КЛІМОВІЧ, дырэктарам Гарадскога асяродка культуры ў Кляшчэлях.

— Ваш асяродак называецца гарадскім; ці ён абмежаваны толькі да саміх Кляшчэль?

— Гэтак вырашылі нашы радныя. Раней асяродак называўся і гмінным, і гмінна-гарадскім, цяпер назвалі яго гарадскім, хаця сваёй дзейнасцю ахоплівае ён тэрыторыю цэлай Кляшчэлеўскай гміны.

— Якія найважнейшыя мерапрыемствы праводзіце ў гадавым маштабе?

— У апошні уік-энд ліпеня ладзім Дні Кляшчэль. Яны доўжацца два або тры дні. Сёлета Таварыства прыяцеляў Кляшчэлеўскай зямлі адзначае сваё дзесяцігоддзе і гэты юбілей святкуем у пятніцу, 27 ліпеня, калі таварыства запрэзентуе мультымедыйны кампакт-дыск „Наша гняздо". У суботу ладзім спартыўны дзень са спаборніцтвамі па пляжным валейболе і паказам стральбы з лука, які арганізуе ўраджэнец Кляшчэль, які зараз жыве ў Беластоку. А ў нядзелю маем канцэртны дзень — сёлета забаўляць публіку будуць нашы калектывы з Дабрывады і Дашоў, маладзёжны ансамбль „Мікстура" з Кляшчэль, два мастацкія калектывы з Беларусі: танцавальны з Высокага і „Каларыт" з Жабінкі, гуральская капэла „Turnioki" ды беластоцкі калектыў „4EVER". Яшчэ ў праграме „Вогненны танец" і народнае гулянне.

У перадапошнюю нядзелю верасня над Рэпчыцкім вадаёмам ладзім — сёлета ўжо трэці выпуск — Пячэнне бульбы. Будзе мастацкая частка ды кулінарная. Прадбачваем віктарыну пра бульбу ды разнароднае яе выпяканне, м.інш. у жары, у сагане пад травою, у сагане ўперамежку з бачком і агароднінай...

У кастрычніку разам з Колам пенсіянераў ладзім Дні сеніёра, у лістападзе разам з Саюзам украінцаў арганізуем агляд вясельных і лірычных песень.

У снежні, у апошнюю нядзелю перад каталіцкімі Калядамі, арганізуем Экуменічную вігілію, у якой прымаюць удзел улады нашага горада і гміны, духавенства ды розныя пакаленні нашых жыхароў. Рыхтуем вялікі стол з вігілійнымі стравамі, многія жыхары прыносяць і свае прысмакі для гэтай нагоды. Школьнікі прадстаўляюць батлейку, людзі спяваюць каталіцкія і праваслаўныя калядкі. Пры гэтай нагодзе бурмістр падводзіць мінаючы год, узнагароджваючы людзей, якія вызначыліся поспехамі, напр. у мінулым годзе былі гэта лаўрэаты конкурсу на найпрыгажэйшы прысядзібны агародчык; годам раней быў конкурс на найпрыгажэйшы прысядзібны плот.

У студзені, у перыяд зімніх канікул, арганізуем заняткі для дзяцей і выезды на басейн у Бельск-Падляшскі. Сёлета праводзілі мы праект „Працягваецца памяць у маёй сям'і". Для ўдзелу ў ім запрасілі мы сорак дзяцей з Дабрывады, Тапаркоў і Кляшчэль. Дзеці вывучалі гісторыю сваіх сем'яў, іх генеалогію, колішнія казкі, старыя кулінарныя рэцэпты. Пасля была прэзентацыя фрагментаў гэтых прац, калі вучні выступалі ў колішніх строях; гэта было і своеасаблівым рэвю колішняй моды, на якім прысутнічалі і продкі выступоўцаў. Усе ўдзельнікі праекта атрымалі рэчавыя ўзнагароды. Былі ўзнагароджаны і святліцы, якія дапамагалі ў правядзенні мерапрыемства: святліца Жыллёвага кааператыва па вуліцы Акацыёвай у Кляшчэлях ды вясковыя святліцы ў Дабрывадзе і Тапарках. Пасля некаторыя гэтыя працы былі прадстаўлены на конкурсе Ваяводскага асяродка анімацыі культуры ды Гміннага асяродка культуры ў Шудзялаве, дзе нашы прадстаўнікі ўзялі — у розных катэгорыях — па адным першым, другім ды трэцім прызе ды адно вылучэнне.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Супрацоўнічаем з Цэнтрам пазашкольнай работы ў Высокім, што ў Брэсцкай вобласці, абменьваемся візітамі. Дзеці з Беларусі былі ў нас на Экуменічнай вігіліі, нашы ў іх на навагоднім Ранішніку. Дзеці сустракаліся з нагоды Валянцінак, у сакавіку ладзілі сумесныя мастацкія майстар-класы. Яны паказалі нам чатыры віды мастацкага рукадзелля: батык на шаўковай аснове, маляванне на драўніне, крыжовы гафт і вышыўку бісерам. Нашых асабліва зацікавіў апошні від рукадзелля, які нашым дзецям быў навінкай. А нашы школьнікі запрэзентавалі маляванне велікодных яек фарбамі і воскам. У ліпені васьмярых работнікаў цэнтра з Высокага нанесла візіт у нашу гміну, дзе знаёміліся з нашай працай, абменьваліся вопытам. Наведалі яны Кляшчэлі, Грабарку, Белавежу і Беласток; кватараваліся яны ў Дабрывадзе. Спадзяюся іх і на Дні Кляшчэль. Бурмістр Кляшчэль, я і яшчэ адзін працаўнік Гарадской управы разам з дэлегацыяй Гайнаўскага староства з мэтай заключэння супрацоўніцтва наведалі Брэсцкую вобласць. Знаёміліся з працай культурных устаноў, прыватных фірмаў, калгасаў, спартыўных арганізацый, наведалі Брэсцкую крэпасць. І лічу, што гэта лепшы метад узаемапазнання чым прэса або тэлебачанне.

Рэалізуем яшчэ праект „Паштоўка". У маі-чэрвені па нядзелях наладзілі мы чатыры веласіпедныя рэйды ў розныя бакі нашай гміны, у якіх прымала ўдзел ад 17 да 24 асоб. Удзельнікі рэйдаў рабілі здымкі, з ліку якіх у выніку адкрытага конкурсу выбярэм найлепшыя для паштоўкі аб нашай гміне. Магчыма, што ў выніку гэтых рэйдаў заснуём веласіпедны клуб.

У жніўні г.г. пачынаем чарговы праект з паўгадовым радыусам з мэтай адукацыі мясцовых правадніковў. Прадбачваю лекцыі спецыялістаў і выезды па нашай гміне і навонкі яе.

Сёлета здаем для карыстання адрамантаваны будынак былой школы ў Кляшчэлях, куды пераселіцца Гарадскі асяродак культуры. Будзе там таксама пункт турыстычнай інфармацыі, керамічна-ганчарная майстэрня, два начлежныя нумары, камп'ютэрная, мастацкая і музычная майстэрні ды глядзельная зала.

Дадам яшчэ, што ў маі, у рамках Дзён царкоўнай музыкі, ладзім у нас канцэрты, сёлета выступалі ў нас хоры з Украіны і Гайнаўкі, а летась — з Грэцыі і Расіі.

— Якія мастацкія калектывы дзейнічаюць у Кляшчэлях і гміне?

— Маем два фальк-

працяг ☞10

Свята ў беларускім засценку (1)

— *Внимание! Станция Парафянов. Следующая остановка Володьки...*

Мне не трэба далей, ні ў Валодзькі, ні ў Полацк, куды ідзе цягнік. Стаю адна на платформе ў Параф'янаве і кагосьці выглядаю. Дзе той незнаёмы, які меў мяне сустракаць? А можа нехта яшчэ прыехаў у Вашунава? Можа гэтая інтэлігентная пара, што разглядаецца направа і налева?

— Ці часам не ў Засцянковую хатку? — падыходжу да незнаёмых з рукзачкамі.

— У Засцянковую хатку, — кажуць, — у госці да спадара Юры Гіля!

Мае новыя знаёмыя — гэта Галя і Валеры Кучынскія са Ждановіч з-пад Мінска.

Валеры кажа, што быў нядаўна ў Кракаве, мае пры сабе нават польскі часопіс... Адразу ў мае рукі пападае кракаўскі гістарычны часопіс з артыкулам Валерыя...

— Трэба *паненку* звазіць у маёнтак Дамейкаў, — прапануе на прывітанне.

Праз момант адчуваю сябе як унучка Ігната Дамейкі з экзатычнага Чылі...

* * *

Не, пра нас не забылі! Пан Янэк, пасланец з засценка, адчакаў аж ад'едзе дызель Маладзечна — Полацк. Каб разам з цягнікам адплыў той ляскат і свіст, а то яшчэ кабылка *Уля* знаровіцца.

— Запрашаю ў сваю машыну! — жартуе дзядзька, які прыехаў за намі на кані, возам.

— Хай *паненка* садзіцца спераду, — прапануе мне Валеры.

У рэшце рэшт спераду сядуць мужчыны, а мы з Галяй, на этнаграфічны манер, адвернемся да іх спіной. І будзем размаўляць — як гэта заведзена ў Беларусі — пра ўраджай. Вядома, калі мінем ужо Параф'янаў, дзе пужалі нас і кабылу цяжкія машыны.

— Кажуць, што з кукурузы нічога не будзе, — гадае ўголас гісторык, — мокры сёлета год для яе. Кукуруза любіць сушу...

— Ага! Не нарасла. Пустая-пусцюсенькая ўсярэдзіне, — ківае галавой у знак згоды пан Янэк.

— А гэта што за такія пасевы? — здзіўляецца ўголас Галя, працаўнік бібліятэкі. Расліна сапраўды дзіўная, нават вазак не ведае яе.

— Проса! — кажу і сама здзіўляюся прысутнасці тут гэтай раслінкі.

Стараюся папасці ў тутэйшы беларускі тон, аднак у мяне няма на гэта шанцаў. Перашкаджае мой выгляд. (Я не бландзінка з сінімі вачыма!)

— А ты сама можа армянка будзеш? — узіраецца скоса на мяне пан Янэк.

— А чаму армянка?!

— Як не армянка, то жыдоўка! — сцвярджае вазак. І адразу дадае, што ў яго вельмі высокае меркаванне пра яўрэяў. Да вайны разам з імі ў школу хадзіў. — Як тыя жыдовачкі харашэ вучыліся!

Невядома да якой яшчэ нацыі прылічыў бы мяне пан Янэк, каб не прысутнасць гісторыка на возе. Валеры зірнуў на мяне халодным вокам акадэміка і аўтарытэтна абвясціў:

— *Паненка* напамінае дзяўчыну са старажытнай Галіччыны.

— А..!

* * *

Спачатку здавалася мне, што падарожжа ў беларускі засценак будзе адначасова падарожжам у часе. Хоць — не зусім так. Мае ўяўленні засценка былі аснаваны на літаратуры пачатку XX ст., асабліва на драмах Купалы і Аляхновіча. А вопыт гаварыў іншае. Такога як шляхецкі засценак не павінна быць у постсавецкай і ўсё яшчэ калгаснай Беларусі. Хоць бы з-за гістарычнай помсты. У засценку, як вядома, напрыканцы XIX і ў пачатку XX стагоддзяў выспявала ідэя адраджэння Незалежнай Беларусі. Адсюль выйшлі пачынальнікі і змагары нацыянальнага руху. Самым актыўным у гэтым плане рэгіёнам з'яўлялася поўнач краіны — гістарычная Віленшчына. Тут найхутчэй даходзілі і сціраліся ідэі з гістарычнай сталіцы ВКЛ — Вільні і тагачаснага імперскага цэнтра — Санкт-Пецярбурга.

І вось напрыканцы мая 2007 года рэдакцыя „Нівы" атрымала запрашэнне ў Засцянковую хатку — на літаратурна-рэлігійную імпрэзу ў Вашунава, што ў Докшыцкім раёне, якую ладзіла Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны Віленскага краю. Найбольш цікавіла тут спалучэнне рэлігіі і літаратуры на грунце беларускай мовы. З'ява, якая ўсё шакіруе на Беласточчыне. А тут яшчэ і каталіцкі засценак!

* * *

Спачатку завіталі мы ў Свіркі. Адсюль выводзіцца па кудзелі род гаспадара Засцянковай хаткі — Юры Гіля. Маці — Феліцыя Кратавіч — прыйшла замуж у Вашунава з прыстойным пасагам. Бацька выправіў дачку з талеркай золата і дзвюма калодамі пчолак... Праўда, яна не была шляхцянкай!

Вось як сам Юры Гіль піша пра с'ямю маці:

У Свірках дзед Антось жыў з бабай Ганнай. /Пладзіў дзяцей, вёў добра гаспадарку, /Хаця любіў і выпіць чарку. /А як падвыпіць, то спяваў: / „Ой, хмелю, дзе ты начаваў?" /За што вясковы люд „хмяльком" празваў. /На самай справе дзед Антось піў мала, /Парадак у хаце быў і сала /(А ў кутку заўжды стаяў бачок мядку). /Сям'я была такая: Мама, тата, /І дзеці — Рузя, Фэльця, Станіслава. /Як сядуць усе, то поўна лава. /У дзеда быў такі размах, / Каб мець для ўсіх дачок пасаг. /Дачок то тры, а на замуж хоць сёння пры. /...Старэйшай Рузі — прымака ўзяў, /А Фэльці, Стасі ў пасаг па талерцы золата даў. /(Таксама Фэльці дзве калоды пчолак даў. /Вось так, дачок нядрэнна замуж павыдаваў: / Рузю — Віктусь узяў (Астроўскі), /Стася ў Барсукі за Сушка пайшла, /А Фэльця ў Вашунаве свайго Петруся знайшла./

Сёння ў Свірках плодзяцца адно пустазелле і дзікія кусты на пакінутых панадворках. У параўнанні з суседнім Лайковам, дзе асталіся дзве ўдавы, у тым ліку адна на кастылях, Свіркі яшчэ жывыя. Большая палова хатак заселеная. На вуліцы гергеталі гусі, там-сям на панадворку мыкала кароўка, недзе ў агародзе завіхалася гаспадыня. Ну і прыехаў з горада дваюрадны брат Юры Гіля — Казік Астроўскі. Спецыяльна на святкаванне ў Засцянковую хатку. Бо самая асноўная справа ў засценку — гэта сямейныя сувязі. Іх не знішчылі час і калектывізацыя...

(працяг будзе)

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Добра мець сяброў...

Пазваніў мне Міхась Куптэль з Сопата.

— Што чуваць, дружа, — дапытваўся калега. — Пад канец ліпеня ў Дабрываду збіраюся. Хацеў был я з табою сустрэцца. Будзеш у хаце?

— Калі здароўе не падвядзе, дык не бачу перашкод, — адказаў я сябруку.

З Міхасём Куптэлем пазнаёміўся я дзякуючы „Ніве". Раней прыходзілася нам спрачацца на яе старонках на тэму дэмакратыі і сучаснай рэчаіснасці. Зараз сталі мы сябрамі. Міхась, напрыклад, прапанаваў свайго часу сустрэцца ў Гайнаўцы ў коле актыўных карэспандэнтаў, але атрымалася асечка — Мікалай Панфілюк з Грышам Марозам не прыехалі. Нам двум кампанію склалі адно Міхась Андрасюк з Міхалам Голубам. У мінулым годзе мы спаткаліся ў Дабрывадзе на агракватэры Міхала Зіневіча. Прыяцелю спадабаліся ветлівыя гаспадары ды сялянская атмасфера. Затым рашыў ён зноў наведаць гэтую мясціну. У час размовы ён прызнаўся, што сёлета прыедзе да мяне ў Кузаву дзеля таго, каб я стаў яму праваднікам па наваколлі ў час веласіпедных экскурсій. Прызнаюся шчыра, што рад буду сустрэчы ды прыяцелю складу кампанію ў час вандровак. Абы надвор'е паспрыяла.

Падтрымліваю ідэю Міхася Куптэля наконт сустрэчы на Гайнаўшчыне як даўнейшага авангарду, так і маладых супрацоўнікаў „Нівы". Не ўсім запрошаным выпала на долю прыехаць на святкаванні 50-годдзя тыднёвіка ў Беласток. Маю тут на ўвазе Петруся Байко, Мікалая Панфілюка, Віктара Буру ды іншых. А з Грышам Марозам у кампаніі мы тады правялі сапраўды цудоўны вечар. Ці ж не варта сёлета адвесці дзянёк вольнага часу на сустрэчу ды прысвяціць яго дзеля супольнай справы? Разважце затым, паважаныя калегі, самі. Час хуценька бяжыць і мінулага не вернеш. Варта аб гэтым памятаць!

Уладзімір СІДАРУК

Марш паняволеных народаў

У нядзелю, 15 ліпеня, у Нью-Йорку прайшоў Марш паняволеных народаў.

Сярод удзельнікаў большасць складалі беларусы. Удзельнічала больш за 40 чалавек у асноўным сябры Беларуска-амерыканскага задзіночання (БАЗА) і Згуртавання беларускае моладзі ў Амерыцы (ЗБМА). Сярод патрабаванняў беларускай грамады былі права на вольнае развіццё беларускай мовы, захаванне суверэнітэту, пратэст супраць русіфікацыі, дамаганне дэмакратыі і свабоды палітычным вязням. Прывітальныя лісты даслалі губернатар Нью-Йорка і мэр Нью-Йорка. Сваёй дзейнасцю Беларуска-амерыканскае задзіночанне і Згуртаванне беларускае моладзі ў Амерыцы спрыяюць таму, што падзеі ў Беларусі знаходзяцца пад увагай амерыканскага Дзяржаўнага дэпартамента.

www.zbma.net

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Белавежскія расказы

Алянёнак Яша

На адной з пагранічных застаў, размешчаных у Белавежскай пушчы, салдаты знайшлі ля паласы бездапаможнае аляня. Малое было настолькі слабое, што не магло самастойна хадзіць і пагранічнікі прынеслі яго на заставу. Паспрабавалі паіць малаком, але яно не рэагавала на ежу. І тады нехта з сельскіх хлопцаў, што там служыў, прапанаваў жывога донара — дамашнюю карову, што ўтрымлівалася на заставе. Спачатку асцярожна падсадзілі малыша да Маняшы, каб паглядзець, як яна прыме чужое дзіця. Рагуля спачатку чмыхнула носам, здзіўлена паглядзела на плямістага „сынка": маўляў, адкуль ён тут узяўся і што яму трэба? Але той так жалобна паглядзеў на прыёмную маці, быццам прасіў: „Не праганяй мяне, я есці хачу, а ад цябе так прыемна малаком пахне..." Маняша зразумела, што цялё, хай і народнае, трэба перш-наперш накарміць, вунь як дрыжыць небарака ад голаду і холаду.

Каб заахвоціць малое да яды і паказаць, што яна прыняла „сірату", карова лізнула алянёнка сваім шурпатым языком, быццам падштурхоўваючы да вымені, і стала спакойна чакаць, калі той адважыцца сам падысці да яе. Ці то покліч продкаў азваўся ў душы дзікага суродзіча, ці свежы ўспамін аб маці-карміцельцы, але алянёнак на слабых ад перажытага стрэсу ножках ступіў да пахучага вымені і ўхапіўся галоднай пысай за цёплае вымя. Маняша цярпліва чакала, пакуль малы ўдосталь нап'ецца сырадою. У той дзень пагранічнікі засталіся без малака. Але ніхто не крыўдаваў, наадварот, вельмі радаваліся, што застаўская карова праявіла сапраўдныя мацярынскія пачуцці і не адштурхнула чужынца.

У хуткім часе алянёнак Яша стаў любімцам усёй заставы, а карову Маняшу ну проста песцілі за яе ўчынак і даравалі яе наровісты характар і спартыўныя „выкідоны". Здаралася, рагуля лёгка пераскоквала любую агароджу, ламала яе і прыводзіла заставу „ў ружжо". З'яўленне малога Яшы істотна сцішыла яе буйства, праявіліся лепшыя каровіны рысы: гатоўнасць аддаць без бойкі сваё малако дзіцяці, а што заставалася — на кашу хлопцам, прапала жаданне да вандровак па пушчы.

Яша вырас, стаў сам здабываць сабе корм у лесе, але заставу не пакінуў назаўсёды. Часта наведвае яе зараз, асабліва любіць, каб яго чымсьці смачным частавалі. Варта паклікаць яго: „Яша! Яша!" — і праз нейкі час малады стройны алянёнак падыдзе да заставы. За выратаваную і прыручаную пагранічнікамі жывёлу яны ў адказе. Ды і Яша разбудзіў у іх сэрцах светлыя, добрыя пачуцці любові да роднай прыроды і жывой істоты.

Таіса СКУРАТАВА
в. Камянюкі
Фота Аляксея БУНЕВІЧА

ГІСТОРЫЯ АБ ТЫМ, ЯК ЗНАЙСЦІ КАХАНАГА ЮНАКА, КАЛІ ВЫ ЯГО РАПТАМ ЗГУБІЛІ

...Ведаеце, як яшчэ бывае? Такое мілае знаёмства, такі цудоўны пачатак: дзяўчына раптам знаходзіць юнака, аб якім даўно марыла, які прыходзіў да яе ў снах, які ведае ейныя любімыя кветкі, нават не пытаючыся аб тым; і які ўмее цалаваць краёчкі вуснаў так, што... О! няма такіх слоўцаў, каб апісаць, як умее ён цалаваць! І было далейшае паміж Ярынкай і Лёсікам: вочы ў вочы пад прыціхлым месячыкам, палёт на арэлях у бездань душы і ў валошкавую аблачынь, гарачы і радасны шэпт з запаветна-адчайным прызнаннем у парку на лавачцы...

А потым... І такое, мае шаноўныя, таксама бывае. Бацькі што Ярынкі, што Лёсіка нечакана і раптоўна вымушаны былі з'ехаць з таго мястэчка, дзе толькі-толькі пачалі раскрывацца пялёсткамі юначыя сэрцы. Яны нават не паспелі ні пабачыцца, ні сказаць адзін аднаму куды ад'язджаюць. І — усё! Ні тэлефонаў, ні адрасоў, ні нават дакладных прозвішчаў не засталося ў іх адно аб адным.

Як жа моцна сумавала потым Ярынка! Магчыма, і горка плакала — ды хіба яна ў тым вам прызнаецца? Дакладна ведаю іншае: як слёзкі крыху падсохлі на міленькіх шчочках дзяўчыны, першае што яна зрабіла, дык закаркавала бутэльку з пасланнем да Лёсіка ды рашуча зашпурнула яе ў сіняе мора-акіян. Толькі і да сённяшняга дня плавае ў акіяне тая бутэлька. Як да сённяшняга дня застаецца бясконца пустэльным увесь Інтэрнэт, дзе таксама не знайшлося ані слядочку ад любага юначыны. Мадагаскарскія пячоры, кожную саламяную капушку, лясочкі-пералескі, дошкі аб'яваў, крамкі і кінатэатрыкі, падземныя пераходы і..., і..., і!.. — усё перавярнула, усюды пабывала ў нястомна-няспынных росшуках сваіх Ярынка. Нідзе не было Лёсіка. Анідзе!.. І нават у космасе, куды злётала разам са сваім дзядзем Тодарам дзяўчына, яго не было таксама.

Жыць болей не было варта. (Хіба не так думаюць бедныя галоўкі дзяўчатак у падобных выпадках?!) Тады Ярынка проста скрала ключы ад бацькавага легкавіка і вырашыла — у апошні раз, хоць бы адным вокам, хоць бы краечкам!.. — паглядзець тое самае мястэчка, той самы парк. Як вы думаеце, каго знайшла, каго ўбачыла яна там на пракаветнай, старой лавачцы? І каму насустрач радаснай трапяткой птушкай ірванулася ейнае сэрца?! Усё верна, мае даражэнькія. Вы не памыліліся і на гэты раз.

А вам усё бяскрайнія космасы ды бязмежныя Інтэрнэты падавай. Ёсць жа яшчэ звычайныя лавачкі. На якіх проста ўмеюць чакаць.

Ваш дзядзечка Сід
25 ліпеня, Кобрын

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

Муха ціп-топ!

Гардкор-2007 або
Муха ціп-топ на канікулах
— 4 —

У чацвёрты дзень лагера „Гардкор-2007” пачаўся бунт. Мы дамовіліся, што не будзем бегаць з Ляскоўскім, не будзем рэагаваць на загады Шакальскіх і не будзем есці іх касмічных страў.

— Што з вамі! — крычаў раз'юшаны дырэктар летніка. — Відаць, хочаце, каб я прыдумаў больш суровую кару!

Ніхто не адзываўся.

— Маю для вас класную прапанову, — сказаў „Шакал”. — Бачу, не хочаце гаварыць са мной па-добраму. Тады, збірайцеся! Пайшлі! Будзем дапамагаць гаспадарам ва ўборцы ўраджаю. Ха-ха-ха-ха!

— Што? — мы адразу зарэагавалі на словы Шакальскага.

— Вы хіба жартуеце! — бунтавалася Соня.

— Я ніколі не жартую! — крыкнуў „Шакал”.

Ён загадаў маршыраваць нам у парах пяць кіламетраў без адпачынку, пакуль не апынуліся мы ў Бондзішках на панадворку нейкага гаспадара. Шакальскі быў знаёмы з земляробам. Ён не першы раз прыводзіў сюды моладзь, каб тая дарма працавала. Мужчыны рашылі, што першая група пойдзе даіць кароў, другая будзе карміць свіней, трэцяя паедзе з гаспадаром на сенажаць вазіць сена.

— Чаму нам прыпала такая цяжкая задача — пратэставаў Янка з маёй групы.

— Бо мы першыя паднялі бунт, — здагадаўся Пецька. — Каб мы былі паслухмяныя, нас не было б тут!

— А мне падабаецца наша кара, — сказала я. — Лепш ужо працаваць у полі, чым сядзець у старой хаце ў лесе.

Цягам двух наступных гадзін мы кідалі вялікія блокі (косткі) сена на прычэп трактара. Калі вярнуліся на панадворак гаспадара, мы былі моцна стомленыя, ледзь трымаліся на нагах.

— Ну і *гардкор!* — пракаментаваў Янак. — Іншыя мелі больш шчасця, чым мы.

Хлапец памыляўся. У першай групе, дзе даілі кароў, многія атрымалі сінякі і гузакі. Каровы не любяць, калі да іх дакранаюцца чужыя рукі. Яны адбіваліся капытамі або ляпілі хвастом па твары. Разам кароў даіла дачка гаспадароў — Агата. Ганка была вельмі зайздросная, бо Філіп, які ёй падабаўся, без перапынку глядзеўся на яе.

„Калі гэта скончыцца, — пыталася ў думках Ганка. — Я не хачу, каб ён закахаўся ў дачку гаспадароў!”

Другая група, што карміла парасят, таксама не мела лёгкага жыцця. Свінні, як і каровы, не любяць новых людзей. Жывёла паразбягалася па палях і лесе. На шчасце былі там яшчэ сыны гаспадара, якім пашчасціла загнаць парасят у хлеў і накарміць. Адзін з гаспадарскіх сыноў падышоў да Соні і папрасіў у яе нумар тэлефона. Дзяўчына заявіла, што на іх летніку мабільнікам нельга карыстацца. Яна дадала, што будзе вельмі ўдзячная, калі хлапец дазволіць ёй са свайго мабільніка патэлефанаваць бацькам.

— Калі ласка, — сын гаспадароў падаў Соні тэлефон, але яна не паспела ім пакарыстацца.

— Стоп! — раздаўся гучны голас. За спіной Соні стаяў сам Генадзь Шакальскі...



Тэкст: natasza9922@wp.pl
Дызайн: lolcia05@tlen.pl

Вершы Віктара Шведа

Анколаг

— Хто гэта анколаг, —
Прыйшоўшы са школы
Даведацца хоча
Цікаўны сыночак.

— Гэта лекар, Якаў,
Які лечыць рака.
— А ці ракі, мама,
Хварэюць таксама?

Мікрабіёлаг

Настаўнік пытае Міколу:
— Хто гэта мікрабіёлаг?
Не знае хлопец развязкі,
Чакае нейкай падказкі.

Прыйшла з дапамогай Марыя:
— Той, хто часта рукі мые,
І гэта ўжо не сакрэтам,
Што нават перад туалетам.

ГАЛЕРЭЯ ДЭКЛАМАТАРАЎ

Аксана Сычэўская — Бельск-Падляшскі

Эвеліна Шыло — Чыжы

Польска-беларуская крыжаванка № 31



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 27:
Слон, саян, танга, купэ, агрэст, струк, ветрык, ваяр, танга, рад. Смак, квет, сук, стан, тэатр, на, грыва, сон, рука, грэк, яр, яны, стог.

Успаміналі Тамару Саланевіч

Дакладна ў сёмую гадавіну з дня смерці нараўчанскай рэжысёркі-дакументалісткі Тамары Саланевіч 18 ліпеня ў Цэнтры прамоцыі рэгіёна „Чарлёнка” ў Гайнаўцы адбылася сустрэча прысвечаная яе памяці. Жыхары Гайнаўшчыны паглядзелі фільмы Тамары Саланевіч, а людзі, якія ведалі яе асабіста, успаміналі вялікую адданасць ураджэнкі Нараўкі працы ў карысць роднай зямлі і гаварылі аб яе незвычайных умеласцях і таленце, які выкарыстала ў час рэалізацыі дакументальных фільмаў.

Шкада, што цяпер штораз менш такіх людзей і фільмаў

З Тамарай Саланевіч многа часу працаваў тэлеаператар Мікола Нестаровіч, якога таксама няма ўжо ў жывых. На гайнаўскае спатканне прыбыў яго сын Пётр Нестаровіч, які таксама добра ведаў славутую рэжысёрку і пачынаў з ёю працаваць. Пётр Нестаровіч пайшоў па слядах бацькі і якраз прыехаў з роднай Орлі, пра якую здымае дакументальны фільм. Тамара Саланевіч з'яўляецца для яго рэжысёрскім узорам.

— Шкада, што цяпер штораз менш такіх людзей, як Тамара Саланевіч, і фільмаў такіх, якія яна стварала. Тамара была дакументалістам еўрапейскага ці нават сусветнага ўзроўню, — пачаў успамін Пётр Нестаровіч. — Была яна вельмі дакладным чалавекам. Рыхтуючы фільмы, яна ведала чаго хоча. Тамара знала, якая музыка ёй патрэбная ў якасці ілюстрацыі для сваіх твораў. Рыхтуючы фільм „Жэртва”, многа разоў кансультавалася з айцом Міхаілам Негярэвічам, каб дэталёва дапрацаваць падборку царкоўнай музыкі. Бывала, што не спала ноччу, каб дапрацаваць сцэнарый. Калі пасля снедання сустракалася са здымачнай групай, яна дакладна тлумачыла як павінен працаваць кожны чалавек і ўвесь калектыў ведаў, што каму рабіць у час здымачнага дня.

Пасля філалагічнай адукацыі і паслядыпломнай журналісцкай школы Тамара Саланевіч у палове шасцідзесятых гадоў стала працаваць на Польскім тэлебачанні ў рэдакцыі рэпартажу і дакументальнага фільма. Тэмамі большасці яе фільмаў была родная Беласточчына, паколькі яна нарадзілася (у 1938 годзе) і выхавалася ў Нараўцы. Многа яе фільмаў было ўзнагароджаных на шматлікіх фільмавых фестывалях. Пад канец дзевяностых гадоў Тамара Саланевіч вярнулася на Падляшша і стала працаваць у Беластоцкім асяродку Польскага тэлебачання.

— Такіх людзей, як Тамара Саланевіч, цяпер практычна няма. Яна ў тры або і чатыры разы даўжэй рэалізавала фільм, чым робіцца гэта звычайна. Па гэтай прычыне ўзнікалі недаразуменні са здымачнай групай, але ў яе ўсё мусіла быць дапрацаваным да канца. Не глядзела Тамара на грошы, але платанічна рабіла фільмы для ідэі, — расказваў Пётр Нестаровіч. — Перад рэалізацыяй фільма Тамара мусіла добра пазнаёміцца з яго героем і пранікнуць у глыб яго душы.

Ганарылася родным

Дырэктар Мікола Бушко, які вёў сустрэчу, паінфармаваў, што бацька Тамары Саланевіч быў свядомым беларусам. Тамара знайшла свайго родзіча ў Савецкім Саюзе. Пасля катаржнай работы ў савецкіх лагерах аставаўся ён без памяці і дачка не змагла падгаварыць бацьку вярнуцца дамоў.

— У час прыватнай размовы Тамара Саланевіч выявіла, што па бацьку астаўся ей капялюш, які ў час сумных хвілін напамінаў ёй родзіча, — дабавіў Мікола Бушко.

— Тамара Саланевіч трымалася сваіх каранёў, а інспірацыю да сваіх фільмаў чэрпала з зямлі, на якой вырасла, — заявіла Марыя Балтрамюк з Гайнаўкі. У час спаткання ўспаміналіся фільмы „Мелодыя душы” і „Жэртва”. Згадваліся таксама фільмы, за якія Тамара Саланевіч атрымала самыя прэстыжныя ўзнагароды.

— „Наша Тамарачка прыехала” — так вясковыя жанчыны гаварылі пра Тамару, — успамінаў Пётр Нестаровіч. — У фільмах старалася яна адплаціць за ўдзячнасць мясцовых людзей. Тамара ганарылася тым, што яна — праваслаўная жанчына з Нараўкі. Калі яе маці прыстарэла, штотыдзень прыязджала яна з Варшавы ў родны дом, каб дапамагчы маме ў сельскагаспадарчых работах.

— Я спаткаў Тамару Саланевіч у „Ніве” і там мы пазнаёміліся. Прыходзіла яна ў рэдакцыю на бяседы да Ады Чачугі, — заявіў сённяшні карэспандэнт і былы супрацоўнік „Нівы” Ян Целушэцкі. — Калі па дарозе ў Нараўку я сустракаў яе, дапамагаў несці багаж і тады завязваліся паміж намі размовы. Тамара Саланевіч прасіла мяне распытацца пра тэмы да яе фільмаў. Гэта я параіў паехаць у Трывежу і зняць там фільм пра невідучага акардэаніста.

www.reporter.edu.pl

Калі Ян Целушэцкі працаваў журналістам газеты „Над Нараўкай”, карыстаўся матэрыяламі прыватнага архіва Тамары Саланевіч пра гісторыю Нараўчанскай зямлі.

— У Тамары Саланевіч былі самыя цікавыя інфармацыі пра гісторыю Нараўчанскай гміны, якія яна давала мне перапісваць. Я з ёй многа гаварыў і дапамагаў ёй пры ўборцы сена. Тамара Саланевіч была асобай адкрытай і раіла мне ў розных справах. Былі ў яе вельмі багатыя планы на будучыню, якіх не паспела рэалізаваць, — расказаў Ян Целушэцкі.

На спатканні была аднакласніца Тамары Саланевіч з Нараўчанскай школы. Аднак яна моцна хвалявалася і адмовілася выказвацца перад вялікай публікай.

— Тамара не патрапіла доўга трымаць службовыя адносіны з людзьмі, з якімі сустракалася ў сваёй працы і хутка пераходзіла на прыватныя суадносіны. Я заўважыла ў яе непасрэднасць і адкрытасць на суразмоўцаў. Тамара не скрывала таксама сваіх слабасцей, — гаварыла Ірэна Парфянюк з цэнтра „Чарлёнка”.

На сустрэчы прэзентаваўся фільм „Горад на акраіне пушчы” — першая стужка Тамары Саланевіч пра Беласточчыну. Расказваў ён пра Гайнаўку 1966 года і ўдзельнікі спаткання паглядзелі яго з вялікай цікаўнасцю. Маглі яны параўнаць тадышні горад з сённяшняй Гайнаўкай. На стужцы паказваліся мясцовыя прадпрыемствы дрэваапрацоўчай прамысловасці і сухой дыстыляцыі драўніны. Хаця памяняліся ўласнікі гэтых заводаў і зараз знаходзяцца яны ў прыватных руках, надалей складаюць яны асноўную частку краявіду Гайнаўкі і даюць месцы працы гарадскім рабочым. Тамара Саланевіч многа ўвагі ў фільме адвяла вуліцы Марыяна Бучка, якая пазней была перайменавана на вуліцу ксяндза Верабея. Многа старэнькіх дамоў стаіць тут надалей і чакае рамонту.

— Шкада, што мала фільмаў Тамары Саланевіч паказваецца па першай ці другой праграме публічнага тэлебачання. Часцей яе фільмы можна ўбачыць на Беластоцкім тэлебачанні, — заявіў Пётр Нестаровіч.

Другі фільм, прэзентаваны на спатканні, падабраны быў невыпадкова. Тамара Саланевіч эмацыянальна была звязана з Міжнародным фестывалем царкоўнай музыкі і ахвотна, з вялікай адданасцю расслаўляла духоўнасць і прыгажосць царкоўнай музыкі ў сваіх тэлеперадачах і дакументальных фільмах. Мастацкія ўмеласці аўтаркі можна было ўбачыць на стужцы, падрыхтаванай пасля Фестывалю царкоўнай музыкі ў 1995 годзе. У размове пасля праекцыі фільма гаварылася пра ўдалую падборку здымкаў да стужкі, дзе ландшафтныя сюжэты супадалі з выступленнямі царкоўных хораў. Цікавым было паглядзець дванаццацігадовай даўнасці сюжэты з гайнавянамі — удзельнікамі двух хораў Свята-Троіцкага сабора.

У 2000 годзе Тамара Саланевіч распачала рэалізаваць фільм пра 99-гадовую жанчыну. Мела яна яго дакончыць пасля смерці бабулькі. Аднак прыйшла каварная хвароба і заўчасная смерць спасцігла дакументалістку. А бабулька пражыла яшчэ сем гадоў (памерла толькі сёлета, у 106-гадовым узросце).

— Тамара Саланевіч здымала таксама фільм у Белавежскай пушчы, які астаўся незавершаным, — паінфармаваў Аляксандр Харкевіч.

У Нараўцы іменем Тамары Саланевіч названы гімназія і галерэя. Радныя горада Гайнаўкі ўшанавалі памяць нараўчанскай дакументалісткі, прысвойваючы яе імя адной з вуліц. Менавіта па ёй распаложаны Цэнтр прамоцыі рэгіёна „Чарлёнка”.

Аляксей МАРОЗ

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Славутую рэжысёрку-дакументалістку і чуллівага чалавека ўспамінае Янка Целушэцкі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Пра Тамару Саланевіч многа расказваў Пётр Нестаровіч

СЯБРОЎСКАЯ БЯСЕДА – ГАРАДОК 28.07.2007

фотарэпартаж Адама Паўлоўскага

Юрка Астапчук, як вядучы гаспадар Бяседы, запрашае да супольных спеваў

Духоўныя і свецкія ўладары Гарадоцкай гміны: справа войт Міхал Кулеша і айцец Мікалай Астапчук

Пад сасной у Борыку ах як смакуе ...

А каму выпала на долю пакаштаваць парсючка ...

Сяброўска-сямейная бяседа з уласнай музыкай

Натоўпы ахвотных адпачыць і загуляць з'ехалі з усёй Беласточчыны

Ксеня і Нюта — мы разам у беларускім садзіку і на бяседах

Сяброўская Бяседа — гэта свет, бачаны не толькі праз мыльныя бурбалкі

http://tbm.org.by

„Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны” існуе ў Беларусі ад пачатку перабудовы. Шмат добрых спраў зроблена гэтай арганізацыяй на ніве беларусізацыі і папулярызацыі беларускай мовы. Рупліўцы беларушчыны дбаюць аб тым, каб — як завяшчаў Францішак Багушэвіч — не пакінуў наш народ мовы беларускай. Бо больш за 80% беларускага насельніцтва лічыць яе роднай. Дзеля іх і працуюць ТБМаўцы.

Зусім нядаўна ў Інтэрнэце з’явіўся адноўлены сайт Таварыства. Гэта вельмі ўсцешвае, бо існаваўшае да апошняга часу віртуальнае прадстаўніцтва ТБМ у Сеціве зусім не адпавядала высокаму ўзроўню арганізацыі. Каля чатырох гадоў там „віселі” навіны, якія з цягам часу цалкам страцілі сваю актуальнасць. Сённяшняя версія сайта адпавядае патрэбам часу.

Месціцца ТБМ у Інтэрнэце па адрасе http://tbm.org.by, мае выдатны дызайн і каляровае аздабленне. Ён падзелены на дзве часткі. Уверсе знаходзіцца агульная для ўсіх старонак шапка, дзе змешчана назва арганізацыі, партрэт славутага першадрукара, а таксама эмблема Таварыства, якая ўяўляе з сябе перамогу сонца над месяцам, гэта значыць святла над цемрай.

Галоўная старонка аналагічная рубрыцы „Навіны”. Менавіта тут з’яўляюцца паведамленні аб найважнейшых падзеях з пункту гледжання кіраўніцтва ТБМ. Праўда, гэтых навінаў не так многа. Магчыма, прычына ў тым, што сайт аднавіў сваю працу толькі ў чэрвені.

Відаць, менавіта тым тлумачыцца таксама і тое, што некаторыя падрубрыкі партала ячшэ не маюць усёй інфармацыі. Так, на старонцы „Аб арганізацыі” мы не знойдзем нічога аб рэгіянальных суполках, хаця „тэрытарыяльна-адміністрацыйныя” загалоўкі ўжо створаныя. У той жа час даволі падрабязна распавядаецца аб гісторыі дзейнасці ТБМ ад пачатку заснавання ў 1989 годзе. Храналагічна пададзеныя звесткі даюць магчымасць яскрава ўявіць усе праблемы, якія стаялі цягам гэтых гадоў перад арганізацыяй і спосабы, якімі яна іх вырашала.

Не залішнім будзе паглядзець, якія задачы ставіць перад сабой Таварыства і якім чынам дасягае сваёй мэты — аднаўлення ў грамадстве стаўлення да роднай мовы як да нацыянальнай святыні, пашырэння яе ўжытку ва ўсіх сферах жыцця Рэспублікі Беларусь, усебаковага развіцця і захавання яе чысціні і самабытнасці, садзейнічання забеспячэнню ёй рэальнага статуса дзяржаўнай мовы. „Галоўная задача ТБМ, — пішуць моўныя рупліўцы, — адраджэнне беларускай мовы ў дзяржаўным, грамадскім і духоўным жыцці народа, а таксама: садзейнічанне зберажэнню і развіццю нацыянальнай культуры і народных традыцый, гістарычнай памяці і фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці, пераадоленню нацыянальнага нігілізму; аказванне неабходнай падтрымкі ў сферы нацыянальна-культурнага развіцця беларусам, якія жывуць за межамі Рэспублікі Беларусь; садзейнічанне адраджэнню на Беларусі нацыянальнай асветы, забеспячэнне ўмоў для бесперапыннай адукацыі на беларускай мове; пашырэнне культурных сувязяў беларусаў з народамі свету дзеля прапаганды беларускай і засваення здабыткаў сусветнай культуры”.

Думаецца, што ТБМ сёння — гэта адлюстраванне таго патэнцыялу беларушчыны, які ёсць вельмі вялікім, але ў той жа час дагэтуль нявыкарыстаным. Без перабольшвання можна сцвярджаць, што пры лагодным стаўленні да беларускай мовы з боку цяперашніх беларускіх улад, сфера яе ўжытку закранала б 80% усіх стасункаў беларусаў з асяроддзем.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Рэха ліпеньскіх перамог

Наш спорт-парад мінулага месяца пачынаем з камандавых дасягненняў. На чэмпіянаце Еўропы па фехтаванні пасля сямі гадоў без медалёў беларуская шабельная зборная выйграла срэбра, саступіўшы ў фінале толькі расіянам. Аналагічны поспех быў у 2000 годзе. Зараз вызначыліся Фёдар Неміровіч, Аляксандр Буйкевіч, Дзмітрый Лапкес і Валерый Прыёмка (трэнер Рыгор Лапатнёў). А нашы стралкі-мужчыны ў розных разрадах узялі срэбра і дзве бронзы ў камандавым спаборы на чэмпіянаце Еўропы па малакаліберная стральбе. Сярод гульнёвых каманд адзначым барысаўскі футбольны БАТЭ, які гераічнымі высілкамі перамог кіпрскую каманду „Апаэль”, перарваўшы сумную традыцыю і першым з айчынных клубаў выйшаўшы ў другі раунд кваліфікацыі Лігі чэмпіёнаў. Пасля паразы ў гасцях 0:2 толькі найбольшыя аптымісты верылі ў барысаўцаў. Але каманда Ігара Крышэнкі з дапамогай фартуны дамаглася чаканага — 3:0.

Далей традыцыйнае прадстаўленне па версіі „Нівы” пяцёрак лепшых спартоўцаў ліпеня.

1. Аляксандр Пархоменка (дзесяцібор’е) стаў пераможцам Кубка Еўропы па шматбор’і, які прайшоў у Таліне, у асабістым разрадзе. У год дэбюту ў суперлізе беларусы выйгралі і камандавы турнір. І зрабілі гэта нават без лідэра нацыянальнай каманды Андрэя Краўчанкі!

2. Мікалай Шубянок (дзесяцібор’е). Яшчэ адзін беларускі „рыцар дзесяці якасцей” стаў у Эстоніі сярэбраным прызёрам.

3. Вадзім Дзевятоўскі (кіданне молата) на мемарыяле Мячэслава Аўсяніка паказаў лепшы вынік сезона ў свеце. У шостым падыходзе ён закінуў молат на 82 м 94 см, перавысіўшы сёлетнее дасягненне Івана Ціхана.

4. Аляксандр Вахавяк (самба) на Сусветных спартовых гульнях па неалімпійскіх відах, што прайшлі ў Кіеве, стаў пераможцам у найбольш прэстыжнай супервагавай катэгорыі. У фінале смаргонскі барэц упэўнена адолеў саперніка з Расіі — 9:1.

5. Уладзімір Ігнацік (тэніс) пасля бліскучай перамогі ў юніёрскім разрадзе на „Ралан Гарос” дайшоў да фіналу і на наступным турніры „Вялікага шлема” — „Уімблдона”, дзе саступіў у фінале старэйшаму амерыканцу Дональду Янгу.

1. Тацяна Драздоўская (ветразевы спорт) на чэмпіянаце свету, які прайшоў у Партугаліі, здзейсніла феерычную сенсацыю. Нечакана для ўсіх яна выйграла залаты медаль у класе суднаў „Лазер-Радыял”. Тым самым Драздоўская здабыла алімпійскую ліцэнзію. Дадам, што такіх чэмпіёнскіх дасягненняў беларускі ветразевы спорт яшчэ не ведаў. Вышэйшым дасягненнем лічылася срэбра Сяргея Харэцкага на першынстве Еўропы ў далёкім 1979 годзе.

2. Кацярына Карстан (веславанне) выйграла апошні этап Кубка свету ў швейцарскім Люцэрне і ўзяла агульны прыз. Перамогі сапраўднай каралевы акадэмічнага веславання можна ўжо не каментаваць.

3. Аляксандра Герасіменя і **Святлана Хахлова** (плаванне) вызначыліся на адкрытых чэмпіянатах Славеніі і Швейцарыі. На агульным рахунку прымаў нашага плавання россып медалёў, у тым ліку 6 залатых.

4. Вікторыя Паўловіч і **Тацяна Кастраміна** (настольны тэніс) на адкрытым чэмпіянаце Кітая заваявалі трэцяе месца ў парным разрадзе.

5. Надзея Астапчук (штурханне ядра) на турніры памяці трэнера Аўсяніка дасягнула лепшага сусветнага выніку сезона — 20 м 34 см, на 30 сантыметраў перавысіўшы паказчык немкі Петры Ламерт. Падобна на тое, што нашы лёгкаатлеты выйшлі на пік сваёй формы.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

4 ☞ працяг

лорныя калектывы: у Дабрывадзе, які зараз налічвае чатыры асобы, і „Каліну” ў Дашах з шасці асоб. Пры Гарадскім асяродку культуры дзейнічае маладзёжны калектыў „Мікстура” з васьмі вучаніц гімназіі і пачатковай школы.

У будучым годзе калектыў з Дабрывады будзе адзначаць саракагоддзе; з самага пачатку выступае ў ім Валянціна Клімовіч. Таксама ў будучым годзе адзначаць юбілей будзе і „Каліна” — трыццацігоддзе. Нашы калектывы запрашаюць на многія мерапрыемствы: у Мельнік, Сяло Буды, Студзіводы, Чаромху...

— ***Можа яшчэ слоў пару пра святліцы ў Вашай гміне.***

— У Кляшчэлеўскай гміне дзевяць святліц: у Жуках, Грузцы, Дашах, Дабрывадзе, Палічнай, Сухавольцах, Саках, Тапарках і Залешанах.

— ***Ці ладзіце ў іх нейкія мерапрыемствы?***

— Не. Дадам яшчэ, што Гарадскому асяродку культуры падлягаюць купальны басейн у Кляшчэлях і пляж у Рэпчычах.

— ***Ці ёсць на Вашай тэрыторыі амфітэатр?***

— Няма. Карыстаемся, пакуль, аўдыторыяй Комплексу школ у Кляшчэлях.

— ***Ці ладзіце нейкія заняткі ў тыднёвым маштабе?***

— Двойчы ў тыдзень адбываецца навука ігры на музычных інструментах. Сёлета гэта піяніна, раней былі акардэон і гітара. З часу, калі няма ў школе музыкі, падае зацікаўленне і нашымі заняткамі, напр. пяць гадоў раней на музычныя заняткі прыходзіла да нас трыццаць дзяцей, а сёлета толькі восем. Пластычныя заняткі адбываюцца толькі ў час канікул.

— ***Як у Вас завязалася супрацоўніцтва з беларускімі суб’ектамі з Брэстчыны: нехта вас „пасватаў”?***

— У мінулым годзе пазнаёмілася я з праектам „Маладыя знаходзяць прыгранічныя шляхі” ў рамках фонду PHARE. Для гэтага патрэбны быў замежны партнёр. Паехала я з сяброўкай да ейных знаёмых у Жабінку, адтуль трапілі мы ў Камянецкі раён, з якім і ўдалося наладзіць супрацоўніцтва. Спярша паехалі ў Беларусь нашы маладыя спартсмены. Я крыху пабойвалася, як маладыя людзі будуць сябе паводзіць, але сюрпрыз быў вельмі прыемны: маладыя людзі выдатна з сабою разумеліся. Беларускія гаспадары прынялі нас вельмі сардэчна, што аж наша моладзь занепакоілася, ці мы зможам гэтак жа прыняць іх. Пасля быў рэвізіт у Кляшчэлі, дзе спартыўныя сустрэчы былі вельмі ўрачыстыя, з дзяржаўнымі гімнамі і сцягамі.

— ***Былі на гэтым можа нейкія афіцыйныя асобы?***

— Нікога такога не было, усе чыны мясцовага значэння. У складзе беларускай дэлегацыі, апрача школьных апекуноў, былі яшчэ тры бізнесмены, якія ў тым часе знаёміліся з працай нашых фірмаў.

— ***Ці супрацоўнічаеце з Беларускім грамадска-культурным таварыствам?***

— Раней супрацоўнічалі, а гэты год нетыповы. У Кляшчэлях адбываліся раённыя агляды беларускай песні ды цэнтральныя школьных тэатральных калектываў. Штогод адбываліся беларускія фэсты; у мінулым годзе асобнага беларускага фэсту не было, але ў рамках Дзён Кляшчэль таварыства прывезла да нас два вельмі добрыя калектывы. Я сама шмат гадоў была ў журы тэатральных аглядаў. Калектывы з нашай гміны бывалі на розных мерапрыемствах ладжаных БГКТ.

— ***Як складваецца Ваша супрацоўніцтва з іншымі грамадскімі суб’ектамі з Вашай гміны, напр. з Таварыствам любіцеляў Кляшчэлеўскай зямлі?***

— У згаданым таварыстве стараемся знайсці цікавых людзей і паказаць у нас іх зацікаўленні, штогод ладзячы адмысловыя выставы. Прэзентавалі мы калекцыю мінералаў нашага земляка Мікалая Падлашчыка, які зараз пражывае ў Мельцы. Былі карціны Аркадзя Ражынскага з Беластока ды Усевалада Косткі — дзіцячага хірурга з Любліна. Былі скульптуры Славаміра Смыка, ураджэнца Дабрывады, які зараз жыве ў Кляшчэлях, Аляксея Васілюка з Бельска ды Міхала Маркевіча, ураджэнца Дабрывады, які жыве ў Беластоку...

— ***У Кляшчэлях і наваколлі шмат архітэктурных помнікаў сакральнага характару. Ці Ваш асяродак апякуецца імі?***

— Не, мы імі не апякуемся, але збіраем інфармацыю пра іх. Апякуюцца імі, у галоўнай меры, самі нашы жыхары.

— ***Сардэчна дзякую за размову.***

Гутарыў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Янка-падарожнік

Янка Целушэцкі, майстар кароткай інфармацыі, вядомы ўсім. Перш за ўсё на Гайнаўшчыне. Ці то пешшу, ці на ровары зведаў кожны куточак роднага павета, і не толькі яго. Ягоную невялікую кампактную постаць распазнаюць здаўна жыхары Беласточчыны, вядомы яго і ціхі спакойны голас, якім распытвае пра весткі. Вядомы ён і чытачам не толькі „Нівы" (дзе найчасцей хаваўся ад пару дзесяткаў гадоў за крыптанімамі ці псеўданімамі). Дарэчы, пісаў амаль ад пачатку існавання нашага тыднёвіка (ад 1958 года), яшчэ як вучань, пасля як настаўнік, потым, ад 1972 г. як журналіст да самай пенсіі (да рэнты па стане здароўя) і цяпер таксама. Няўседлівы пенсіянер-журналіст і дзеяч прыкмечаны рэдакцыяй „Всуплчэснай газеты" — а перш за ўсё яе чытачамі — і стаў Індывідуальнасцю года з Гайнаўшчыны ў конкурсе аб'яўленым рэдакцыяй гэтай найстарэйшай у нашым рэгіёне штодзённі.

Рэдакцыя запрасіла на адмысловую ўрачыстасць больш за дзесяць лаўрэатаў з усяго ваяводства, а найбольш непаседлівыя і не дабраліся. Каго занялі справы, а каму... проста не даехаў аўтобус, як Янку Целушэцкаму — аўтобус прыехаў у Нараўку, а там і папсаваўся, назад у сталіцу ваяводства не даехаў! Даюць нам такія растрапаныя машыны-недабіткі, быццам мы ў нашым тут старонні ўжо такія апошнія! Такія справы абураюць і гневаюць сумленнага чалавека, перашкаджаюць у нармальным і людскім жыцці кожнаму на сваім месцы. Янка Целушэцкі і такімі справамі займаецца — каб нармальна было. Каб была вада ў людзей, каб аўтобусы ездзілі, каб чалавек свядома жыў у асяроддзі, не падсякаў галіны, на якой сядзіць... Можна было б падумаць: але, вось і вялікія справы! Гэта ж проста як дрот! Відавочнае, зразумелае. Мо і нявартае шмат слоў. Тым больш, што часам як гарохам аб сцяну кідаеш — не пачуюць „уладныя"... Каго зганіць трэба і варта, іншы варты пахвалы. Хто падумаў бы — а чаго і хваліць, кожны хай выконвае свае абавязкі. А якраз тыя ціхія працаўнікі справы і, не чакаючыя пахвалы, маленькія героі, што часам і на веласіпедзе калясяць па родных сцежках, і пешшу іх стоптваюць, што ведаюць кожнае дрэўца на абочыне нашых палеткаў — яны і „людзі года", і большага часу.

— Як я трапіў у спісак найбольш вядомых грамадствам асоб нашага ваяводства? — усміхаецца Янка Целушэцкі, жыхар Ляўкова. — Аб'явіла плебісцыт „Вспулчэсная". Галасы аддало 6 тысяч асоб. У першым туры гэта чытачы прапанавалі асобы годныя ўвагі, звання Індывідуальнасці года. Пасля запаўнялі купоны і высылалі ў рэдакцыю. Мяне цяпер выбралі радным, да таго старшынёй

грамадскай і сацыяльнай камісіі. Мабыць, людзі былі ўдзячны мне за тое, што я дапамагаю ім у розных справах, і таму пэўна мяне запрапанавалі. Пасля галасы аддавалі на нас чытачы, высылаючы купоны ў рэдакцыю. У першым туры я атрымаў 96 галасоў. З Гайнаўскага павета нас было чатыры асобы, м.інш. Марэк Антонюк, Міхал Дрынькоўскі, уласнік „Царскага рэстарана", была ардынатарка гінекалагічнага аддзела шпіталя ў Гайнаўцы Рэната Вашчук. У другі тур з 96 перайшло толькі 15 асоб. Ну, тут ужо пайшла непрымірымая барацьба! Я паказаўся ў шырэйшым маштабе. Я сустракаўся з людзьмі нават на фэстах. Падтрымалі мяне нават і чыноўнікі! Людзі высылалі купоны, а нават эсэмэскі (а каштавалі яны па 2,44 зл.!). Некаторыя казалі, што няма чаго мне стартаваць у ваяводстве, хопіць мне і Гайнаўскі павет, але шмат мне памаглі. У другім туры я атрымаў 238 галасоў. Я не бізнесмен, не маю шырокіх знаёмстваў, як гэты пан-бізнесмен з Браньска, які выйграў увесь ваяводскі плебісцыт — ён і вядомы, і мае чулае сэрца, і большыя магчымасці памагчы людзям і ім канкрэтна ды багата памог.

Янка Целушэцкі рады перш за ўсё таму, што вяскоўцы выбралі яго радным. Жартуе, за словамі Алеся Барскага: „Ты старайся, а народ цябе *папрэ*", — добры вынік у плебісцыце сведчыць аб яго папулярнасці. Часта заходзіць да суседзяў. Тыя кажуць: „Янка, мы такога раднага яшчэ не мелі, каб быў у мяне ўжо тры разы! Хто падумаў бы, што радны прыходзіць да мае жонкі!"

— Я ведаю, хто зацікаўлены не толькі сваімі гаспадарскімі справамі, але і грамадскімі. Я і распытваю, што хацелі б, каб я сказаў на сесіі. Што не так, ціхенька, усё добра. Няма так усё добра. Таго трэба нам — сказаць, нейкую дарогу адрамантаваць... Змыла ў нас над мосцікам цэлую абочыну ў роў. Звярнуліся ў Павятовае праўленне дарог, пагаварыў я на сесіі, войт выслаў запатрабаванне — зроблена. Пазарасталі нашы павятовыя дарогі быллём у рост чалавека. Можаце праверыць — у нас ужо ўсё зроблена, абкошана. Я цяпер змагаюся вось за што: прасіў, гукаў (сесіі не было, але я ў тым часе дабіваўся) — за школу ў Ляўкове, якая зачынена, пустуе. Пра яе ўсе забылі. А пустазелле аж пад дах, параслі кусты пад школай як лес. Непрыгожа. Гарантавалі, што на гэтым тыдні будзе ўсё ў парадку. Удалося і са страшнымі выбоінамі на ваяводскай дарозе, ад Бандароў да Ляўкова.

Быццам бы малаважныя справы, ды відаць безгаспадарнасць і брыдоту. Трэба — Янка Целушэцкі ўскоквае на ровар, едзе ў павет. „Чаму ж мне дагэтуль не ўдалося такую справу *залатвіць*? Сам пан кіраўнік ведае, я тут у вас тры ці чатыры разы быў..." Часам бывае, што цяжка з чымсьці прабіцца, ды спакойная настойлівасць Целушэцкага спраўляецца з *запарцем* чыноўнікаў.

Радны ён першую кадэнцыю. Ды і дагэтуль ведалі яго радныя не аднаго трэміну. Ён як жыхар Ляўкова не абмінаў ніводнай сесіі самаўрада, выступаў як жыхар не толькі Ляўкова. Бачыў справы Капітаншчыны, Нараўкі, паднараўчанскіх вёсак. І як журналіст бачыў шмат спраў незавершаных. Браў голас у самым канцы. Шмат спраў дапамог вырашыць. „Як цябе бачаць, так цябе і пішуць!"

— Маю цяпер такую мару і план: пракласці тратуар са Старога Ляўкова ў Новае. Няма ходніка, людзі ходзяць па шашы — небяспечна. Грузавікі возяць цэглу, вельмі вялікі рух. Пасля дажджу стаяць агромныя лужыны, няма дзе схавацца. У гэтым годзе — а гэта павятовая дарога — маю абяцанні, што напэўна тратуар будзе. Мы са свае гміны даем 50 тысяч, рэшту дакладвае староства. Цяпер мушу ведаць канкрэтна тэрмін, каб не дацягнуць да снежня! Гэта невялікая інвестыцыя, хоць у каля 2 кіламетраў. З гэтай тэмай хаджу ўжо шмат часу.

Янка Целушэцкі, хоць мае хворыя вочы, прыкмеціць зусім дробныя справы. Толькі закапае ў вочы „Ксалятан". І зноў бяжыць. Чатыры гады ў Прысёлку людзі прасілі дарогу. А ён „дабегаўся" да паловы зімы (праўда, тады дарог не будуюць, ды да 15 студзеня не было сапраўднай зімы) і дарогу зрабілі. У Лясной прасілі памагчы — Целушэцкі паставіў пытанне рубам: калі хочаце, каб Нараўчанская гміна развівала і агратурызм, дык памажыце і ў гэтай дзялянцы. І дарога ёсць. І дапамагае канкрэтным людзям, асабліва старэйшым. Настолькі давяраюць яму, што нават з банка прывозіць ён ім цэлыя іхнія месячныя пенсіі. І дапільнаваў, каб у санаторыю паехалі, урэшце адпачылі і падлячыліся. Пакуль мае сілу. Жадаем і яму здароўя!

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Да 20-ых угодкаў смерці

Успамін аб Кастусю Ляшчынскім

Хаця прайшло 20 гадоў з дня смерці Кастуся Ляшчынскага, у гайнавян захаваліся цёплыя ўспаміны аб гэтым цікавым і заслужаным для горада чалавеку. Нарадзіўся ён 5 кастрычніка 1933 года ў Макаўцы Нарваўскай гміны ў беларускай сялянскай сям'і. Ягонае дзяцінства прыпала на ваенны час. Падставовую школу закончыў ён у Нарве, затым вучыўся ў Эканамічным тэхнікуме ў Элку. Пасля атрымання сярэдняй адукацыі стаў працаваць у Гмінным кааператыве „Сялянскай самадапамогі" ў Нарве на пасадзе бухгалтара. У 1961 годзе назначаецца старшынёю Гарадской рады нарадовай у Гайнаўцы (адпаведнік сённяшняга бурмістра). На гэтай пасадзе заставаўся да 1974 года. У 1974-1975 гадах працаваў сакратаром Павятовай рады прафсаюзаў у Гайнаўцы, а ў 1975 годзе стаў на пасаду намесніка старшыні гайнаўскага кааператыва ПСС „Сполэм" і працаваў там да заўчаснай смерці, якая спасцігла яго 6 жніўня 1987 года.

Кастусь Ляшчынскі быў прыроджаным грамадскім дзеячам. Першапачаткова дзейнічаў у маладзёжным, пасля ў самаўрадавым, кааператыўным і беларускім рухах. Людзі ведалі яго далёка па-за Гайнаўкай. Стараўся ён выслухаць кожнага, дапамагчы і не пакінуць у бядзе. Дзверы яго кабінета заўсёды былі адчынены для ўсіх наведвальнікаў.

Многа зрабіў ён для добраўпарадкавання горада і развіцця яго культурнай актыўнасці. З 1969 года дзейнічаў таксама ва ўправе Таварыства сяброў Гайнаўкі. За дасягненні на прафесійнай і грамадскай ніве атрымаў шмат узнагарод, вянцом якіх быў Афіцэрскі крыж Ордэна Адраджэння Польшчы, прысвоены яму ў 1984 годзе.

Кастусь Ляшчынскі не дбаў пра матэрыяльнае багацце, не меў машыны, з жонкай і сынам жыў у невялічкай кватэры ў блоку. Быў ён сціплым, адданым Гайнаўцы — гораду, з якім звязаў свой жыццёвы лёс — чалавекам. Такім асобу Кастуся Ляшчынскага захавалі ва ўдзячнай памяці гайнавяне, якім прыйшлося сустрэць яго на сваіх жыццёвых сцежках.

Віктар БУРА

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2007 r. upływa 5 września 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Południ. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1 000 egz.

Суседскія былі

ШАЛЁНАЯ ЛІСА

Бабка Ганна ўжо тыдзень сцвярджала, што надышоў канец свету. Напачатку прычынай такіх глабальных высноваў была нечакана напаўшая, без аб'яўлення вайны, жывёльная хвароба яшчур, пасля чаго цэлы раён апынуўся ў палоне каранціну. Ні выехаць адтуль без дазволу, ні ўехаць туды. Трохі пазней здарылася яшчэ некалькі няшчасцяў лакальнага маштабу, кшталту моцнага граду, што ў друшляк пабіў толькі што налітыя маладой чырванню памідоры, нібыта над імі папрацаваў ашалеўшы ад нацысцкай ідэі кулямётчык Ганс. Пасля Ганна даводзіла вяскоўцам, што даўнодаўно, як яна была малая, яе бабулька раскрыла страшную як ноч у пекле тайну пра тое, што менавіта сёлетні год і ёсць апошнім. А ўрэшце яе высновы стала пацвярджаць сама прырода. У лесе, з невядомае прычыны, пашалелі лісы ды вожыкі. І ўжо некаторых сабак ды людзей паспелі пагрызці сваімі атрутнымі зубамі.

З сабакамі было прасцей. Іх папросту стралялі, аблівалі бензінам ды пускалі на вецер у выглядзе чорнага дыму і невыноснага смуроду паленай плоці. А вось людзей прыходзілася лавіць і адвозіць у напаўпрагніўшую раённую бальніцу з такім наборам антысанітарных умоваў, якіх мала ў якой публічнай прыбіральні знойдзеш. А там няшчасным давалі настолькі балючыя ўколы ў жывот, што пацыенты малілі неба, каб прароцтва Ганнінай бабулі хутчэй збылося. Гатовыя былі на ўсё, абы не цярпець такія пакуты, якіх нават фашысцкія начальнікі кулямётчыка Ганса не прыдумалі для ворагаў Трэцяга Рэйха. Адным словам, у раёне народ моцна запанікаваў.

Толькі дзед Астап Дзергачоў пасмейваўся і з раённых уладаў, і з дактароў, і са сваёй жонкі — бабкі Ганны. І некаторыя з ім пагаджаліся, бо чалавек ён быў у вёсцы паважаны, сур'ёзны, але не занудлівы. І цяпер казаў, што дастаткова ягоную Ганну адну завезці ў шпіталь, вылечыць яе шаленства шляхам прамывання мазгоў і жыццё ў раёне зноў вернецца ў былое спакойнае і размеркаванае рэчышча.

— Ёлупень ты стары, — агрызалася тая. — Ты то ўжо пажыў, лабідуда, і мяркуеш, што табе няма чаго губляць. Але пра душу падумай. Ідзі лепш паспавядайся перад смерцю.

— А мне на халеру тое здалося, — пасмейваўся стары. — Ты ж кожны дзень да крэўскага папа лётаеш. Адспавядалася хіба ўжо за цэлы раён. Людцы могуць цяпер ісці на неба са спакойным сэрцам, бо ім з тваіх малітваў ужо прыгатаваныя ў раі самыя лепшыя месцы. А лепш за ўсё памаўчы, ды не смяшы народ, бо дурны чалавек павінен слухаць, а не гаварыць. Маўчанне дэбіла — найразумнейшая на свеце рэч. А тое што ты звар'яцела — факт, які прымаецца без абмеркавання, бо на старасці гадоў вожыкаў баяцца стала.

— Ну то сам маўчы, — злавалася на мужа Ганна. — Прыйдзе час, што яшчэ мяне ўспомніш як прыпячэ.

І прыпякло. Выйшаў неяк Дзергачоў раніцай на ганак і бачыць як ліса з яго сабакам грызуцца. Відаць, лясная зладзейка хацела курыцу забраць, але сабака ўгледзеў. Дзед хапіў вілы ды адным ударам зрабіў у лісе чатыры дзіркі. Хоць стары, але спрыту яшчэ не згубіў. Пасля ўзяў рыжую за хвост і павалок за вёску выкінуць у які роў. А як вярнуўся, на падворку ўжо стаяла машына хуткай дапамогі ды санітары ў белых халатах. Бабка сядзела ў машыне ды раўла горкімі слязамі, перажываючы, што яе ўласны канец надыходзіць на некалькі дзён раней, чым канец свету для ўсяго чалавецтва.

— Сядайце ў машыну, — цвёрда адрэзаў дзеду адзін з санітараў. — Хутчэй за ўсё ліса была шалёная. Рызыкаваць нельга. Сабаку вашага мы ўжо спалілі. Вас будзем лячыць.

— Уколы ў жывот лупіць будзеце? — нямым голасам прасіпеў Дзергачоў. Ён адразу прыпомніў аповеды былых пацыентаў пра жахлівы боль такога лячэння і ад страху ледзьве не развітаўся з душой.

— Лячыць будзем так, каб вылечыць, — паправіў яго мужчына ў белым халаце, але дзед апошніх слоў ужо не чуў. Ён у імгненне вока, як малады напрактыкаваны яфрэйтар, развярнуўся на абцасах на сто восемдзесят градусаў і сігануў у куст агрэсту, нават не адчуўшы калючак. Пасля перамахнуў праз плот і кінуўся да бліжэйшага лесу.

— Стой, прыдурак, — разрываліся лекары, несучыся наўздагон. — Ты ж хворы і небяспечны для грамадства! Шаленства ад чалавека да чалавека таксама перадаецца!

— Пень ты стары, — раўла з машыны хуткай дапамогі Ганна. — Здохнеш у лесе адзін як воўк з пенай на вуснах і не будзе нават каму цябе засыпаць! Вярніся пакуль не позна!

Але дзед ужо стаў часткай лясного ландшафту і жывым вырашыў не здавацца. На што ж гэта падобнае, каб на старасці гадоў легчы пад уколы, якіх баяўся з дзяцінства і ні аднаго разу за ўсё жыццё не адважыўся наведаць доктара. Не, гэта не для яго. Лепш палётаць шалёным па лесе і пакусаць пару-тройку вожыкаў, чым аддаць сябе на такія здзекі.

— Лётае як малады, — запыхаўшыся ад пагоні, давёў Ганне санітар. — Нічога, мы яго зловім. А як не, то сам вінаваты. Пакуль вас вылечым, ён ужо будзе абмяркоўваць прычыны ўцёкаў са святым Пятром.

Дзеда шукалі ўсе адказныя за тое службы. Мясцовы ўчастковы хаваўся ўначы ў кустах, каля яго хаты. Марыў злавіць старога. Але той не вяртаўся. А праз нейкі час усе вырашылі, што Дзергачоў даў дуба недзе ў лесе і знайсці яго зараз можна будзе толькі па спецыфічным паху.

Неўзабаве і Ганну выпісалі са шпіталя. Тая, цяжка ўздыхнуўшы, зайшла ў хату, уключыла святло і хацела памаліцца за душу мужа. Хоць і не заўсёды ладзілася ў яе з ім, але ж пражылі неяк разам добрых некалькі дзесяткаў гадоў. І толькі ўкленчыла яна перад абразамі, пусціла з левага вока салёную як расол з-пад агуркоў слязу, як у хату ўваліўся сам Астап. Жывы і здаровы. Толькі худы, галодны ды зарослы як агарод у гультая.

— Есці давай, — буркнуў ён і вострым нажом адпаласаваў ладны кавалак паляндвіцы.

— А божачка! Ты жывы! — пляснула ў далоні Ганна. — А дзе ж ты хаваўся? А што ж ты еў?

— У склепе адседзеўся, — жадна жуючы, адгукнуўся Астап. — А есці зусім нічога не было. Ну то я тую лісу з'еў, якую вы шалёнай палічылі. Ціхенька агеньчык развяду сабе, падсмажу і грызу. Гадкая паскуда. Але гэта лепш чым у шпіталь. А цябе там паралолі ўколамі? Зараз, напэўна, ты ўжо не шалёная. Ну то добра. Можа перастанеш расказваць байкі пра сваю бабулю. Хоць пакой будзе людзям у вёсцы і крэўскаму папу таксама. А ты там ад уколаў не загнулася? Каб адкінулася, то я цябе не шкадаваў бы, з-за дурноты тваёй. А вось сабаку шкада. Спалілі яго, злыдні, ні за што. Ён быў здаравейшы за тых лекараў, ды яшчэ і разумнейшы ў некалькі разоў. Прынамсі, хоць лісаў не баяўся. А ты дазволіла яго са свету звесці, як падлу якую. А яму б жыць ды жыць яшчэ. Ай, які быў сабака! Чуеш, усе вясковыя сукі ўжо другі месяц па ім выюць.

Віктар САЗОНАЎ

05.08 – 11.08

Баран (22.03. — 20.04.) Будзеш мець адвагу, каб выкласці карты на стол! Выразна запратэстуеш, калі табе штосьці не будзе падабацца. Не бойся правалу, ды не будзь помслівы. Свет прафесійных поспехаў адкрыўся перад табою шырока.

Бык (21.04. — 21.05.) Будзеш нервовы і выбуховы. Старайся не займацца бізнесам, бо раптоўнасць можа зашкодзіць. Заробак на канікулах будзе багаты. У пары гармонія.

Блізняты (22.05. — 22.06.) Дасканалы настрой, паафармляеш усе справы, з якімі ніхто не мог справіцца. Усё, што патрабуе высілку, будзе мець для цябе вялікую вартасць.

Рак (23.06. — 23.07.) У пачуццях будзь адважны, бо справы пакінутыя на волю лёсу не пойдуць па тваёй думцы. Дойдзеш да раўнавагі, калі пазбудзешся прыкрых эмоцый.

Леў (24.07. — 23.08.) Зусім інакш глянеш на сябе, іншых людзей і розныя сітуацыі, якіх нядаўна ты не даў рады перайсці. Узрастуць аптымізм, самаўпэўненасць. Ты — крэатыўны, поўны новых ідэй — сустрэнеш інспіруючых цябе людзей.

Дзева (24.08. — 23.09.) У жартах на тваю тэму ёсць зернейка праўды. Ты цяпер крыху меланхалічны. Не разлічвай на іншых. Сапраўдныя сябры гэта тыя, якія табе не зайздросцяць.

Шалі (24.09. — 23.10.) Аддасі ўсё каханню. Змаганне за сваё і клопат за сям'ю прынясуць багатыя плады. Бачаць цябе цяпер як прынцэсу ці прынца. Хоць 6-10.08. могуць быць непаразуменні з партнёрам (вісіць на валаску супольнае падарожжа).

Скарпіён (24.10. — 22.11.) Ты агорнуты хцівасцю, неапанаваны. Сцеражыся, каб табе з вачэй не прапала найважнейшае. З блізкімі гавары шчыра і канкрэтна, сваркай нічога не высветліш. Неспадзяваныя шанцы здабыць вялізны маёнтак!

Стралец (23.11. — 22.12.) Прачнуцца ў табе вялікія здольнасці! Можаш запісацца на курсы замежных моў, пачаць новыя студыі. Твой аптымізм проста заразны! Можаш цяпер пераносіць горы!

Казярог (23.12. — 20.01.) Даведаешся аб свеце і правах кіруючых ім зусім новых рэчаў. Пастарайся перажыць рамантычныя хвіліны з каханай асобай, а пачуцці выбухнуць з новай сілай. Усё паробіш удвая хутчэй.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Адчуеш цвёрды грунт пад нагамі. Можаш разлічваць на нечаканую фінансавую падтрымку ад родных. У прыватных справах будзеш такі адважны, аж нахабны — ніхто перад табою не ўстаіць!

Рыбы (20.02. — 21.03.) Адчуеш падтрымку кагосьці, на каго ніколі раней ты не разлічваў. Маеш шанц распусціць крылы. У сям'і гармонія і дасканалае паразуменне. Прыцягваеш усіх сваім досціпам, какетлівасцю. Ды грошай у хату прынясе больш за цябе твой партнёр (увесь месяц...)

Агата АРЛЯНСКАЯ

Адгаданка

1. грэчаская сталіца, 2. манаршае крэсла, 3. не без добрых людзей, 4. краіна з Барселонай, 5. чалавек немусульманскай веры, 6. адзінка сілы, 7. сын Ісаака, 8. партнёр кумы, 9. аўтар сатырычных твораў, 10. дзяржава са Стортынгам, 11. прызыўны зварот.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — прыказка. **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 26 нумара

Веер, дуга, Ева, куча, мова, пампа, роў, рысь, цыцка.

Рашэнне: **Гаворыць воўк пацеры а сам пра авечку думае.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.



ISSN 0546-1960